

КАМУ ЯШЧЭ МЯСТЭЧКА Ў ІТ?

ЧЫРВОНКА

АТРЫМАЦЬ СМС АД... ВОЎКА



ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 109 (28976)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ТУРЧЫН, першы намеснік прэм'ер-міністра, старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва:**

*«Цяпер асноўная наша работа — фарміраванне абласных саветаў па развіцці прадпрымальніцтва. Урад павінен выпрацаваць тыпавое палажэнне аб абласным савеце, і цяпер якраз ідзе работа над гэтым дакументам. Абласныя саветы — гэта людзі, якія знаходзяцца на месцах і ведаюць галоўныя праблемы бізнесу. Хацелася б, каб пытанні, якія ўваходзяць у кампетэнцыю мясцовых органаў улады — зямельныя, маёмасныя, — вырашаліся на ўзроўні абласных саветаў па развіцці прадпрымальніцтва. Тут павінны фіксавацца тыя праблемы, якія ёсць на месцах, але пры гэтым носяць не лакальны, а агульнасістэмны характар. Гэта дазволіць акумуляваць такія праблемы ў Савеце па развіцці прадпрымальніцтва і выходзіць у тым ліку з заканадаўчымі ініцыятывамі».*

# НА ПАДВОРКУ ПРЫБЫЛО!



**На падворку паштальёна вёскі Бытча Людмілы СТАІН адбылося чарговае папаўненне — нарадзілася цялятка. І, вядома, у першую чаргу гаспадыня клапоціцца пра гэтае «немаўлятка». Цяпер статак рагуль на бытчанскім двары налічвае ажно чатыры галавы, акрамя іх — конік, парсючкі, гусі, куры. Цяпер гарачая пара, трэба нарыхтоўваць сена, таму працы ў гаспадароў непачаты край!**

**Людміла Міхайлаўна пяць гадоў носіць пошту ў Старабарысаўскім паштовым аддзяленні, любіць сваю работу, хутка і з настроем забяспечвае сваіх аднавяскоўцаў перыёдыкай, пісьмамі, пераводамі. І ў той жа час увішная жанчына з'яўляецца прыкладам працалюбства, клапатлівай матуляй і жонкай.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **На адну арэндную кватэру ў Мінску паступае каля 200 заявак.**

• Тэмпературны рэкорд 82-гадовай даўніны пабіты ў Мінску 11 чэрвеня.



• **VII Міжрэгіянальнае свята «Зялёныя Святкі» пройдзе 16 чэрвеня на крыніцах Байкава Чавускага раёна.**

• Футбалісты нацыянальнай зборнай пацярпелі чацвёртае паражэнне ў кваліфікацыі Еўра-2020, саступіўшы ў Барысаве камандзе Паўночнай Ірландыі з лікам 0:1

# «НАША ЗАДАЧА — ЗРАБІЦЬ СВЯТА»

MINSK 2019 2nd EUROPEAN GAMES

**Спецыялісты Дырэкцыі II Еўрапейскіх гульняў расказалі, як пройдуць медальныя цырымоніі і што чакае беларусаў і гасцей у фан-зонах краіны. Буйны спартыўны турнір — гэта заўсёды не толькі спорт, але і яскравае шоу, свята, якое пачынаецца на цырымоніі адкрыцця і працягваецца ўсе астатнія дні. Беларускія арганізатары выйшлі на фінішную прамую ў падрыхтоўцы да Еўрапейскіх гульняў.**

СТАР. 15




# АНЁЛ-АХОЎНІК ДЛЯ КАЦІ...

## Як у Магілёве спрабуюць вырашыць праблему з бадзяжнымі жывёламі

**Пушыстая трохкаляровая кошка з'явілася каля нашага шматпавярховіка невядома адкуль. Пяшчотная і даверлівая, яна зусім не баялася людзей. І прыгажуня была рэдкая. Некаторыя нават абяцалі забраць яе дамоў — і аднойчы забралі. А на наступны дзень яна зноў сядзела каля нашага пад'езда. Яе прыгожая мордачка была ўся змятая, з рота капала кроў, адно вока наогул не адплюшчвалася. Хутка высветлілася, што аўчарка патэнцыйных гаспадароў не прыняла кошку ў «сям'ю», а людзі не палічылі патрэбным ратаваць знявечаную істоту. Небарака сапраўды здавалася безнадзейнай — адным словам, памірала.**

### ІМЯ СПРАЦАВАЛА

Не хвалюйцеся, Каця жывая. Каця — гэта імя кошкі. А яшчэ яе анёла-ахоўніка — валанцёра Кацярыны. У магілёўскае таварыства абароны жывёл «Добрае сэрца» я тады патэлефанавала хутчэй ад бездапаможнасці. На сігнал прыбегла дзяўчына, пасадзіла гаротніцу ў пераноску і папярэдзіла: шукайце вашай падапечнай гаспадара. Потым Каця дасылала ў «Вайберы» справаздачы, а я баялася іх глядзець. Перабінтаваная кошка з нейкімі трубачкамі здавалася мне яшчэ больш безнадзейнай. Але дзяўчына падбадзёрвала. І сапраўды, праз некалькі тыдняў мурлыку было ўжо не пазнаць.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

## МАРШРУТ МІНСК — БІШКЕК

**Аляксандр Лукашэнка 13—14 чэрвеня з рабочым візітам наведае Кыргызскую Рэспубліку.**

Беларускі лідар прыме ўдзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, дзе наша краіна мае статус дзяржавы-назіральніка.

Запланавана выступленне Прэзідэнта падчас пасяджэння савета ў пашыраным складзе. Ён акрэсліць пазіцыю Беларусі па актуальнай міжнароднай тэматыцы і далейшым развіцці супрацоўніцтва ў рамках гэтага інтэграцыйнага аб'яднання.

**Паводле БелТА.**

# ВЫБАРЫ ІМКНУЦЦА ДА АНЛАЙНУ

## Што зменіцца ў выбарчым працэсе ў Беларусі?

**«Параўнальны аналіз» выбараў прэзідэнта Казахстана, якія адбыліся ў нядзелю, і кампаній, якія маюць адбыцца ў нашай краіне, робіць старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі Лідзія ЯРМОШЫНА.**

На яе думку, падчас выбарчых кампаній будуць актыўна выкарыстоўвацца сацыяльныя сеткі. «Да гэтага перайшоў увесь свет. Так, на выбарах прэзідэнта Украіны казалі, што спадар Зяленскі ўвогуле не карыстаўся тэлевізійным часам і не сустракаўся з выбаршчыкамі: уся агітацыя праходзіла цалкам у глабальным сеціве», — разважае Лідзія Ярмошына, якая была міжнародным назіральнікам на выбарах у Казахстане.

Старшыня ЦВК называе гэты спосаб агітацыі вельмі перспектыўным, але і небяспечным, бо ён практычна не кантралюецца: немагчыма вызначыць, колькі сродкаў на гэта расходавана, невядомыя крыніцы фінансавання. «Па сутнасці, нельга паназіраць, ці не парушаюцца правілы передвыбарнай агітацыі. Гэта цягне вялікія схаваныя рызыкі, бо Выбарчы кодэкс, створаны ў 2000 годзе, гэтага ніяк не рэгулюе», — лічыць Лідзія Ярмошына. На яе думку, кандыдаты чакаць не будуць і скарыстаюцца магчымасцямі сацыяльных медыя.

Казахстанскую норму, якая патрабуе ад кандыдата мінімум пяцігадовага досведу работы ў дзяржаўнай службе ці на выбарнай дзяржаўнай пасадзе, Лідзія Ярмошына лічыць спрэчнай. «Не магу ацаніць яе як дэмакратычную. Увогуле яна рэдка сустракаецца, нават не ведаю, дзе я падобнае бачыла. У Беларусі змен у гэты бок не будзе: навошта абавязкова абмяжоўваць? Бо, атрымліваецца, тады дакладна прыйдзе чалавек з каманды кіраўніка дзяржавы, раз ён ужо быў на дзяржслужбе. У такім выпадку адзін чыноўнік проста змяняецца на іншага», — аналізуе старшыня Цэнтрвыбаркама.

Адзначыла Лідзія Ярмошына і пэўную мадэрнізацыю выбарчых працэсаў у абедзвюх краінах: «Так, у Казахстане зараз я ўпершыню ўбачыла адмысловыя кабіны для інвалідаў, сродкі для галасавання невідушчых. У Беларусі выкарыстоўваюцца трафарэты для сляпых грамадзян, у метадычныя рэкамендацыі мы таксама заклалі неабходнасць стварэння спецыяльных месцаў для галасавання інвалідаў, патрабуем наяўнасці безбар'ернага асяроддзя».

«Метадычна мы цалкам гатовыя да выбараў. Падрыхтаваныя ўсе інструкцыі — гэта самы вялікі матэрыял, які трэба вырабіць друкарскім спосабам. Адразу пасля абвяшчэння выбараў цалкам зможам забяспечыць рэгіёны, бо там будуць фарміравацца камісіі», — паведаміла старшыня ЦВК і растлумачыла, што каляндарны план пакуль што ўтрымлівае толькі пералік мерапрыемстваў, а дакладныя тэрміны кампаній будуць узгоднены пазней.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Жыллёвая палітыка

# Калі арэндная кватэра можа стаць сацыяльнай?



**У першых чыслах мая ў нашай краіне была прынятая новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса, якая ўнесла змены ў пытанні рэгулявання атрымання жылля з Дзяржаўнага фонду. Пра тое, як змяніліся падыходы да выдзялення арэнднага і сацыяльнага жылля, расказала намеснік начальніка аддзела юрыдычнай работы і кадраў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Вольга ГЕРМАН.**

### Сіротам не пакой, а асобнае памяшканне

Навіна нумар адзін. Цяпер тыя, хто мае права на сацыяльнае жыллё, але пражывае ў арэндным, могуць перавесці яго ў разрад сацыяльнага. Дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, па заяве апекуна або папячыцеля маюць магчымасць змяніць статус арэнднага жылля, наймальнікамі якога з'яўляюцца, і не плаціць за карыстанне квадратнымі метрамі. Акрамя дзяцей-сірот такое права прадугледжана для 17 катэгорый грамадзян, якія па законе могуць прэтэндаваць на атрыманне сацыяльнага жылля.

Навіна нумар два. Раней выканаўчыя ўлады маглі даць людзям, якія маюць права на сацыяльнае жыллё, пакой з агульнай кухняй. Сем'ям з дзецьмі-інвалідамі або людзям з цяжкімі хранічнымі захворваннямі жыць у такіх умовах было складана. Таму ў кодэкс унеслі змяненне: абавязалі мясцовыя ўлады даваць сацыяльнае жыллё ў выглядзе асобных кватэр. Дзеці-сіроты, дзеці, што засталіся без апекі бацькоў, і іншыя катэгорыі грамадзян, якія маюць права на сацыяльнае жыллё, заўсёды будуць атрымліваць асобную кватэру, а не пакой.

### Безбар'ерны доступ

Новы Жыллёвы кодэкс уносіць яшчэ адну важную папраўку. Цяпер людзям з інваліднасцю, што карыстаюцца дзяржжылфондам, выканкам павінен знайсці такі варыянт жылля, які будзе адпавядаць іх фізічнаму стану, гэта значыць забяспечыць безбар'ерны доступ у кватэру, каб чалавек змог выходзіць на вуліцу і паўнапраўна жыць у грамадстве. «Па яго заяве выканкам павінен знайсці варыянты добраўпарадкаванага жылля, якія будуць забяспечаны неабходнай інфраструктурай, размяшчацца на першым-другім паверхах», — адзначыла Вольга Герман.

### Працягваць можна, прыватызаваць нельга

Па існуючых правілах пры засяленні людзей у арэнднае жыллё іх здымаюць з чаргі на льготнае будаўніцтва, і яны становяцца закладнікамі арэндных метраў, прыватызаваць якія па заканадаўстве нельга. Варыянт прыватызацыі арэнднага жылля па-ранейшаму не разглядаецца і не абмяркоўваецца.

У выпадку атрымання арэнднай кватэры, якая забяспечвае ўсіх членаў сям'і квадратнымі метрамі ў дастатковай меры, сям'я ўсё гэтак жа будзе здымацца з чаргі тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэты падыход захаваны, паколькі арэнднае жыллё даецца наймальнікам у пастаяннае (!) карыстанне. Калі чалавек выконвае ўсе свае абавязацельствы па аплаце камунальных паслуг і спраўна плаціць за карыстанне жылым памяшканнем, кожныя пяць гадоў выканкам абавязаны працягваць дагавор найму. Гэта значыць, дзяржава гарантуе людзям, што пры выкананні ўмоў дагавора яны змогуць жыць у арэндным жыллі столькі, колькі захочуць.

Выключэнне складаюць супрацоўнікі, якія атрымалі арэндную кватэру на перыяд працоўных і службовых адносін. Як і раней, іх не будуць здымаць з чаргі тых, хто мае патрэбу, бо ў выпадку спынення працоўных адносін яны абавязаны будуць вызваліць такую кватэру.

### У запасе — каля 142 тысяч кватэр

Найбольш запатрабавана дзяржаўнае здымнае жыллё ў сталіцы. На адну кватэру камерцыйнага выкарыстання ў Мінску паступае ад 50 да 200 заявак.

Прыкладна 30 % арэнднага жылля прызначана для тых, хто мае першачарговае права на яго атрыманне. У іх ліку маладыя спецыялісты, служачыя, якія атрымалі адукацыю за кошт рэспубліканскага ці мясцовага бюджэту, работнікі пры назначэнні на пасаду ў выпадку пераезду з іншага населенага пункта. Яшчэ прыкладна 10 % арэндных кватэр выдзяляецца вайскоўцам і прыраўнаваным да іх асобам.

Астатнія 60 % прапанаванага арэнднага жылля дзяржжылфонду даецца грамадзянам, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Але пры адсутнасці прэтэндэнтаў з ліку чаргавікоў (такая сітуацыя можа быць у невялікіх гарадах і вёсках) засяліцца могуць і іншыя катэгорыі грамадзян.

Вольга Герман адзначыла, што рынак арэнднага жылля ў краіне развіваецца з 2014 года. Новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса сістэматызуе прававыя нарматыўныя акты ў сферы жыллёвых праваадносін, у тым ліку карэктуе пытанні рэгулявання арэнднага жылля. У цэлым арэндны жыллёвы фонд у краіне, па звестках на 1 сакавіка гэтага года, налічвае 142 410 кватэр, з іх 121 тысяча — тыя, што раней адносіліся да службовых жылых памяшканняў і выдзяляліся па дагаворах найму.

Сёлета плануецца пабудаваць яшчэ 135 тысяч квадратных метраў арэнднага жылля. Больш за ўсё яго з'явіцца ў Гродзенскай вобласці (33,25 тысячы квадратных метраў), а таксама ў Гомельскай (28,35 тысячы квадратных метраў) і Брэсцкай (26,25 тысячы квадратных метраў). У Мінску ўвядуць у эксплуатацыю 11,4 тысячы «квадратаў», у Мінскай і Віцебскай абласцях — па 10,5 тысячы квадратных метраў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### «Новыя» краіны ЕС выступілі з ініцыятывай паскорыць працэс пашырэння супольнасці



Трынаццаць «новых» краін ЕС выступілі з ініцыятывай паскорыць працэс пашырэння Еўрасаюза, актывізаваўшы прыём дзяржаў Заходніх Балкан, каб не дапусціць новага вітка нацыянальных і рэлігійных супярэчнасцяў у рэгіёне. Як паведаміў брусельскі партал навін EURACTIV, 10 усходнееўрапейскіх дзяржаў плюс Аўстрыя, Італія і Мальта падрыхтавалі зварот да Савета ЕС з заклікам як мага хутчэй запусціць перагаворы аб уступленні Албаніі і Паўночнай Македоніі. Еўракамісія ў маі ўжо рэкамендавала пачаць перагаворы з гэтымі краінамі, аднак цяпер рашэнне павінны зацвердзіць або адкласці ўсе краіны супольнасці ў Савеце ЕС, дзе яго запуск блакуе шэраг дзяржаў Еўрасаюза, у прыватнасці Францыя і Нідэрланды. «Гэты зварот стане формай ціску (на «старыя» краіны ЕС . — **заўв. ТАСС**) з мэтай пацвердзіць, што дылема — пашырэнне ЕС або паглыбленне інтэграцыі ўнутры супольнасці — няправільная і абодва працэсы павінны ісці паралельна, — цытуе EURACTIV аднаго з аўтараў дакумента. — У адваротным выпадку мы зноў сутыкнёмся з пытаннем Заходніх Балкан, але ў значна больш балючай і праблемнай для абодвух бакоў форме».

### Улады Мексікі абвясцілі пра разгортванне буйнога кантынгенту Нацгвардыі на захадзе краіны

Больш за 3,5 тысячы байцоў Нацыянальнай гвардыі Мексікі з 1 ліпеня пачнуць несці службу ў штаце Халіска на захадзе краіны разам з паліцыяй і вайсковымі падраздзяленнямі. Пра гэта паведаміў міністр грамадскай бяспекі і абароны грамадзян Альфонса Дураза, перадае газета Milenio. Чакаецца, што да 2021 года колькасць прадстаўнікоў гэтай сілавой структуры ў рэгіёне дасягне 7,6 тысячы чалавек. Мексіка ў апошнія некалькі гадоў перажывае небывалы разгул гвалту. Летась у краіне былі забітыя звыш 33,3 тысячы чалавек, сёлета сітуацыя на федэральным узроўні працягвае пагаршацца. Паводле афіцыйных звестак, са студзеня да сакавіка ахвярамі злачынцаў стала звыш 8,73 тысячы чалавек — амаль на 9 працэнтаў больш, чым за той жа перыяд мінулага года.



Раней прэзідэнт Мексікі Андрэс Мануэль Лопес Абрадор прызнаў цяжкасці ў барацьбе са злачыннасцю. Ён таксама паведаміў, што ўладам давядзецца выдаткаваць больш часу, чым яны меркавалі, каб палепшыць становішча ў сферы бяспекі.

### У Італіі ўхвалілі дэкрэт, які забараняе несанкцыянаваны заход суднаў у парты Апенін



Урад Італіі ўхваліў дэкрэт, які прадугледжвае спагнанне штрафаў з суднаў, што ажыццяўляюць несанкцыянаваны заход у тэрытарыяльныя воды і парты краіны. Як паведаміў навінавы канал Rai News 24, памер штрафу будзе вар'іравацца ад €10 тыс. да €50 тыс. Пры паўторным парушэнні судна можа быць канфіскавана. Мера не пашыраецца на ваенныя і ўрадавыя караблі некамерцыйнага прызначэння. Акрамя таго, міністр унутраных спраў можа прымаць рашэнне аб забароне на заход таго ці іншага судна па меркаваннях бяспекі, узгадняючы яго з міністэрствамі транспарту і абароны, а таксама інфармуючы прэм'ер-міністра. Нягледзячы на тое што ў фінальным тэксце дакумента няма ўвязкі з мігрантамі, ясна, што галоўным чынам гаворка ідзе пра судны няўрадавых арганізацый, якія прыбываюць у італьянскія парты з выратаванымі ў моры нелегаламі. У адобраным дакуменце пашыраюцца паўнамоцтвы і фінансаванне паліцэйскіх у цывільным, якія забяспечваюць ахову правапарадку падчас дэманстрацый. Узмацняецца жорсткасць пакаранняў за акты гвалту падчас спартыўных мерапрыемстваў. На прыняцці дадзенага дэкрэта настойваў кіраўнік МУС і віцэ-прэм'ер Матэа Сальвіні.

Добрая навіна

# ПАТОКІ ПАЦЫЕНТАЎ РАЗДЗЕЛЯЦЬ ПА ЗОНАХ

**У Стаўбцоўскай раённай цэнтральнай бальніцы пасля рэканструкцыі адкрылася прыёмнае аддзяленне.**

Яно зроблена з улікам сучасных патрабаванняў усіх нарматыўных дакументаў і падзелена на зоны. Зялёная зона прызначана для зваротаў амбулаторных пацыентаў, жоўтая — для тых, хто некаторы час (да сутак) можа знаходзіцца ў аддзяленні ў выпадку дыягностыкі захворвання або лячэння, якое не патрабуе шпіталізацыі.

У чырвонай зоне размешчана рэанімацыйнае аддзяленне. Сюды будуць дастаўляцца пацыенты з экстраннымі захворваннямі.

Такая структура дазваляе забяспечыць якасную медыцынскую дапамогу пры раздзяленні патокаў пацыентаў.

Рамонт аддзялення выкананы ў сучасным стылі. Тут абсталяваны эндаскапічны пакой, пакой ультрагукавой дыягностыкі, кабінеты для прыёму ўрачоў-тэрапеўтаў, хірургаў, гінеколагаў і іншых. Арганізавана таксама рэгістрацыя пацыентаў у зале чакання з інфармацыйным табло і тэлевізарам, па якім дэманструюцца відэаролікі аб здаровым ладзе жыцця.

Усе рабочыя месцы інфарматызаваныя і падключаны да лакальнай сеткі ўстановы, што вельмі важна для эканоміі часу і атрымання своечасовай інфармацыі аб пацыентах. Акрамя таго, праведзена відэаназіранне з вывадам камер у кабінет галоўнага ўрача і начальніка па медыцынскай частцы для кантролю за арганізацыяй работы супрацоўнікаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# НОВЫ КОРПУС БАЛЬНІЦЫ



Лабараторны аналізатар.

Фота БелТА.

**У Брэсце ўрачыста адкрылі прыбудову да прыёмнага аддзялення гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.**

Гэта сціпла называецца «прыбудова», а насамрэч узведзены новы трохпавярховы корпус прыёмнага аддзялення. А паколькі ўказаная бальніца знаходзіцца на цэнтральнай вуліцы Леніна побач з аднайменнай плошчай, то пад'езд да прыёмнага пакоя бальніцы з вуліцы быў вельмі нязручны. Цяпер уваход у прыёмнае аддзяленне размяшчаецца ў двары. І гэта зусім іншы ўзровень камфорту. Пра неабходнасць будаўніцтва гаварылі даўно, і вось корпус здадзены пад ключ.

Тут ёсць лабараторыі і розная сучасная апаратура. Сюды нядаўна завезены два новыя тамографы: рэнтгенаўскі камп'ютарны тамограф і апарат МРТ агульным коштам больш за 3 мільёны рублёў. Расходы на набыцці апаратаў узяло на сябе Міністэрства аховы здароўя. А будаўніцтва прыбудовы фінансаваў гарадскі бюджэт.

Павіншаваць бальніцу з наваселлем прыйшоў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# КАДЭТЫ РАЗВІТАЛІСЯ СА СЦЯГАМ

**У Мінскім абласным кадэцкім вучылішчы адбыўся выпускны баль.**

За час існавання навучальнай установы ў Слуцку пуцёўкі ў жыццё атрымала 350 кадэтаў. Сёлета яе закончылі 63 выпускнікі: ім былі выдадзены атэстаты аб агульнай сярэдняй адукацыі і знакі выпускніка вучылішча. У рамках свята адбылася таксама цырымонія развітання са Сцягам кадэцкага вучылішча.

Атэстаты, знак выпускніка і памятны пагон навучэнцам уручалі госці — прадстаўнікі Галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама, кіраўнікі сілавых структур Мінскай вобласці і Слуцкага раёна, ветэраны Узброеных сіл Беларусі, прадстаўнікі Слуцкай і Салігорскай епархій.

Мінскае абласное кадэцкае вучылішча функцыянуе з 1 верасня 2010 года. Яго заснавальнік — Мінаблвыканкам. Больш за 230 (65 %) выпускнікоў атрымліваюць адукацыю ў навучальных установах сістэмы нацыянальнай бяспекі, праходзяць службу ў раённых аддзелах міліцыі, па надзвычайных сітуацыях, а таксама ў арміі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Открытое акционерное общество «Молодечненский завод металлоизделий» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

Имущества, расположенного по адресу: Минская область, Молодечно, ул. Промышленная, 4, в составе:

**Здания, ограждение, сети:**

**Лот № 1**. Изолированное помещение (помещение гальванического участка) **306,1 кв. м**; ванны гальванические, инв. № 115; виброустановка, инв. № 17321; виброустановка, инв. № 17322; гальваническая линия цинкования до блеска, инв. № 1112; емкости 34 куб. м, инв. № 116; калорифер (тэн 1,5 кВт – 6 шт.), инв. № 2050; компрессор (Индия), инв. № 626; кабельные линии, инв. № 4015; кабель, инв. № 4019; канализация общего назначения, инв. № 4021; внутриплощадочные канализационные сети, инв. № 4023; внутриплощадочные водопроводные сети, инв. № 4024; **Лот № 2.** Изолированное помещение (помещение гальванического участка), 427,3 кв. м; изолированное помещение (помещение сборочного участка), инв. № 630/D-29942; кабельные линии, инв. № 4015; кабель, инв. № 4019; **Лот № 3.** Капитальное строение (котельная новая), инв. № 630/С-45429, составные части и принадлежности: металлический склад красок (литер 10); капитальное строение (подстанция), инв. № 630/С-45414; капитальное строение (здание трансформаторной подстанции), инв. № 630/С-74599; трансформатор силовой 400/10/0,4, инв. № 612; трансформатор силовой ТМЗ-630/10, инв. № 611; камеры КСО-272 (14 шт.), инв. № 620. кабельные линии, инв. № 4015; кабель, инв. № 4019; **Лот № 4**. Капитальное строение (сварочный (токарно-штамповочный) цех), инв. № 630/С-45434, составные части и принадлежности: металлическая холодная пристройка (литер 1), кирпичная холодная пристройка (литер 2), металлический сарай (литер 20); кабельные линии, инв. № 4015; кабель, инв. № 4019; канализация общего назначения, инв. № 4021; внутриплощадочные канализационные сети, инв. № 4023; внутриплощадочные водопроводные сети, инв. № 4024; **Лот № 5.** Капитальное строение (ангар (сварочный участок), инв. № 630/С-45438; кабельные линии, инв. № 4015; кабель, инв. № 4019; водопровод, инв. № 4020; канализация общего назначения, инв. № 4021; внутриплощадочные канализационные сети, инв. № 4023; внутриплощадочные водопроводные сети, инв. № 4024; **Лот № 6.** Капитальное строение (ангар склада химии), инв. № 630/С-74598; **Лот № 7.** Капитальное строение (центральная проходная), инв. № 630/С-45441; кабельные линии, инв. № 4015; кабель, инв. № 4019; водопровод, инв. № 4020; ограждение территории, инв. № 017; **Лот № 8.** Капитальное строение (склад металла), инв. № 630/С-45412, составные части и принадлежности: металлический навес (литер 12); стеллажная эстакада, инв. № 018; кабельные линии, инв. № 4015; кабель, инв. № 4019; **Лот № 9**. Уборная, инв. № 016; **Лот № 10**. Автомобиль грузовой бортовой тентованный MAZ 437043; **Лот № 11**. Булерьян тип 4, инв. № 627Э; **Лот № 12**. Вертикально-сверлильный станок, инв. № 02-008; **Лот № 13.** Вертикально-фрезерный станок 6М12П, инв. № 06-012; **Лот № 14.** Выпрямитель для дуговой сварки ВДУ-506С, инв. № 3024; **Лот № 15**. Машина сверлильная на электромагнитном основании МС-8, инв. № 26-033; **Лот № 16.** Полуавтомат сварочный ПДГО-510, инв. № 3023; **Лот № 17**. Полуавтомат сварочный NB-500 (А160-500ФА) (Китай), инв. № 3025; **Лот № 18.** Пресс гидравлический ПЛГ – 01.000.00 ПС листогибочный, инв. № 26-032; **Лот № 19.** Резак газовый HANDY AUTO, инв. № 26-066; **Лот № 20.** Рольганг 17,8, инв. № 26-045; **Лот № 21.** Сварочный аппарат Jasic TIG 180A 11, инв. № 3048; **Лот № 22.** Сварочный станок ВДУ-506, инв. № 3002; **Лот № 23.** Сварочный полуавтомат Kemppi Kempomat 250, инв. № 3005; **Лот № 24.** Сварочный полуавтомат Kemppi Kempomat 250, инв. № 3006; **Лот № 25.** Сварочный полуавтомат ПДГ-201УЗ «Гефест-2», инв. № 3022; **Лот № 26**. Сварочный полуавтомат ПДГ-211, инв. № 3014; **Лот № 27**. Сварочный полуавтомат ПДГ-211УЗ «Гефест-3», инв. № 3015; **Лот № 28.** Сварочный полуавтомат ПДГ-211УЗ «Гефест-3», инв. № 3030; **Лот № 29.** Сварочный полуавтомат ПДГ-211УЗ «Гефест-3», инв. № 3031; **Лот № 30.** Сварочный полуавтомат ПДГ-211УЗ «Гефест-3», инв. № 3032; **Лот № 31.** Стол для цеха сварки, инв. № 3052; **Лот № 32.** Стол для цеха сварки, инв. № 3053; **Лот № 33.** Стол для цеха сварки, инв. № 3054; **Лот № 34.** – Стол для цеха сварки, инв. № 3055; **Лот № 35.** Установка компрессорная СБ4/С-200.ТС3065, инв. № 3098; **Лот № 36**. Компрессор 2ВКв. м,5-12/9, инв. № 606; **Лот № 37.** Компрессор ВВ-10/8, инв. № 605; **Лот № 38.** – Компрессорная станция (компрессор ВП2-10/9М, компрессор 202ВП-10/8, 2 воздухосборника 6,5 куб. м и 10 куб. м), инв. № 615; **Лот № 39.** Машина точечной сварки МТР-280, инв. № 13-030; **Лот № 40.** Бесцентрошлифовальный станок, инв. № 08-003; **Лот № 41.** Бесцентрошлифовальный станок, инв. № 08-007; **Лот № 42.** Установка СМЖ-357 для правки и резки арматурной стали, инв. № 09-032; **Лот № 43.** Вертикально-фрезерный станок, инв. № 06-001; **Лот № 44.** Галтовочная установка, инв. № 02-015; **Лот № 45.** Галтовочная установка, инв. № 02-016; **Лот № 46.** Грузоподъемная тележка НК 318, инв. № 601; **Лот № 47.** Компрессор, инв. № 628; **Лот № 48.** Ножницы гильотинные, инв. № 09-007; **Лот № 49.** Ножовка обрезная механическая Н-1, инв. № 08-002; **Лот № 50.** Пресс листогибочный кривошипный ИТ1330ОВ; **Лот № 51.** Радиально-сверлильный станок 2Н55, инв. № 02-009; **Лот № 52.** – Система технологического видеонаблюдения Axiom, инв. № 10081; **Лот № 53.** Станок сверлильный 2Н135, инв. № 02-002; **Лот № 54**. Термопластавтомат Д3132, инв. № 02-031; **Лот № 55.** Токарно-револьверный станок 1Д325П, инв. № 01-007; **Лот № 56.** Токарно-револьверный станок 1Д118, инв. № 01-009; **Лот № 57.** Токарный станок SN-401*1500, инв. № 01-010; **Лот № 58.** Токарный станок 163, инв. № 01-006; **Лот № 59.** Универсально-заточной станок 3Е642Е, инв. № 03-018; **Лот № 60.** Устройство внутренней связи Maxicom MP35, инв. № 10017; **Лот № 61.** Полуавтомат для накатки резьбы UPW 12х5х70, инв. № 09-015; **Лот № 62**. Станок круглошлифовальный 3Б153, инв. № 03-003; **Лот № 63** Сверлильный станок, инв. № 02-014; **Лот № 64.** Станок универсально-заточной 3А64, инв. № 02-007;

Земельный участок, на котором расположены объекты недвижимости: кадастровый номер 642000000002000542, общая площадь 2,4130 га (доля в праве) расположен по адресу: г. Молодечно, ул. Промышленная, д. 4. Назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах, а также подробная информация об имуществе оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайтах:

1) www.minsk-region.gov.by в разделе Работа с инвесторами «Одно окно» (Раздел 5). Аукционы по продаже недвижимости). 2) www.molodechno.minsk-region.by/ru/economy/aukcion в разделе «Аукцион». 3) www.realt.by в разделе «Аукционы».

Аукцион состоится **26.06.2019 г.** в 11.00 по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. 17 Сентября, д. 32. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **24.06.2019 г.** в рабочие дни до 15.00 по указанному адресу. Тел. +375 29 6853677


Май на ўвазе!

# Аплата праезду ў цягніках — карткай

**Беларуская чыгунка сумесна з ААТ «БПС-Ашчадбанк» укараніла ў цягніках гарадскіх ліній сістэму аплаты праезду з выкарыстаннем бескантактавых банкаўскіх плацежных картак, а таксама смартфонаў, смарт-гадзіннікаў і іншых мабільных прылад, якія падтрымліваюць тэхналогію NFC (Near field communication).**

Упершыню ў краінах СНД у чыгуначным транспарце арганізавана аплата праезду з дапамогай бескантактавых банкаўскіх картак. Гэта ўнікальны вопыт для далейшага развіцця электронных спосабаў аплаты праезду ў цягніках, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.

Аплата праезду адбываецца па поўным тарыфе з выкарыстаннем бескантактавых банкаўскіх плацежных картак Visa PayWave, MasterCard Contactless і БелКарт-Maestro. Зараз у рамках пілотнага праекта можна аплаціць праезд бескантактавай банкаўскай карткай або смартфонам ці смарт-гадзіннікам з выкарыстаннем мабільнай прылады, што падтрымлівае тэхналогію NFC (далей — ББК) у цягніках гарадскіх ліній у межах аднаго тарыфнага пояса: на ўчастках Мінск — Беларусь, Мінск — Міханавічы і Мінск — Гарадзішча.

Аплата ажыццяўляецца пры пасадцы. Прынцыпы функцыянавання, архітэктура, а таксама механізмы забеспячэння бяспекі транзакцый для рэалізаванага рашэння ўзгоднены з міжнароднымі аплатнымі сістэмамі.

Навінкай з'яўляецца і тое, што з дапамогай адной ББК магчыма аплаціць праезд некалькіх пасажыраў (да пяці чалавек). Для гэтага неабходна паўторна прыкласці картку або смарт-прыладу да валідатара.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Падзея

# Да свята спорту і дружбы

**Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» падрыхтавала і выпусціла ў свет кнігу на беларускай і англійскай мовах «Спорт вышэйшых дасягненняў. II Еўрапейскія гульні — свята міру, спорту, дружбы народаў Еўропы» ў серыі «Беларусь спартыўная». Кніга атрымалася не проста цікавая, а ў многіх адносінах пазнавальная, з адмысловым высокамастацкім афармленнем.**

З чатырох раздзелаў выдання чытач даведаецца пра гасціннасць беларусаў, пра ролю спорту ў жыцці нашай краіны, пра гісторыю выбару яе месцам правядзення Гульняў, пра выбар талісмана. Цікава, з яркімі ілюстрацыямі расказваецца пра эстафету агню «Полымя міру», пра абрысы медалёў, віртуальны даведнік, размяшчэнне гасцей у «Студэцкай вёсцы», пра валанцёраў, якія будуць задзейнічаны ў 20 розных кірунках. Асобна прадстаўлены ўсе спартыўныя арэны, на якіх пройдуць спаборніцтвы.

Знаёміць кніга і з гісторыяй — у ёй падрабязна прааналізаваны вынікі першых Гульняў, што адбыліся ў горадзе Баку ў 2015 годзе. Пры гэтым асноўная ўвага аддаецца менавіта дасягненням беларускіх спартсменаў. Дадзены падрабязны экскурс і ў гісторыю алімпійскага руху ў Беларусі — на старонках выдання можна пабачыць фатаграфіі вядомых у мінулым спартсменаў, даведацца пра іх дасягненні, пазнаёміцца з сучаснымі алімпійцамі, якія заваявалі ў гісторыі незалежнай Беларусі 96 медалёў, у тым ліку 20 залатых, 32 сярэбраныя, 44 бронзавыя.

Завяршае кнігу алімпійскі слоўнік на беларускай і англійскай мовах, а агністае лісяня Лесік шчыра запрашае ўсіх адкрыць для сябе Беларусь.

**Міхаіл БЕРДНІК.**

Будзь у курсе!

# НЕЛЬГА ВА ЎГОДДЗІ Ў 47 РАЁНАХ

**Абмежаванні, па інфармацыі Міністэрства лясной гаспадаркі, дзейнічаюць у Полацкім раёне Віцебскай вобласці, у Маларыцкім і Баранавіцкім раёнах Брэсцкай вобласці, шасці раёнах Гродзенскай (Астравецкім, Смаргонскім, Ашмянскім, Іўеўскім, Лідскім і Воранаўскім), шасці раёнах Магілёўскай (Краснапольскім, Касцюковіцкім, Хоцімскім, Быхаўскім, Асіповіцкім і Бялыніцкім), 13 раёнах Мінскай (Стаўбцоўскім, Дзяржынскім, Мінскім, Смалявіцкім, Слуцкім, Старадарожскім, Салігорскім, Любанскім, Барысаўскім, Валожынскім, Уздзенскім, Пухавіцкім і Чэрвеньскім) і амаль па ўсёй Гомельскай вобласці (акрамя Кастрычніцкага і Жыткавіцкага раёнаў).**

Рашэнні па ўвядзенні і зняцці забароны на наведванне лясоў прымаюцца мясцовымі органамі ўлады па хадайніцтве лесагаспадарчых устаноў або раённых аддзелаў па надзвычайных сітуацыях. На сайце Мінлягаса размешчана інтэрактыўная карта, па якой можна адсочваць увядзенне і зняцце абмежаванняў у сваім рэгіёне. Карта аператыўна абнаўляецца.

Для ліквідацыі лясных пажараў у Мінлягаса маюцца 257 пажарна-хімічных станцый, а таксама 660 пунктаў супрацьпажарнага інвентару, якія ўкамплектаваны неабходнай колькасцю сродкаў пажаратушэння. Выкарыстоўваюцца 545 пажарных аўтамабіляў, больш за 360 бочак для падвозу вады, 355 лесапажарных модуляў для апаратыўнага тушэння, 1803 мотапомпы і 12,6 тысячы ранцавых апырсквальнікаў, больш за 1 тысячу глебаапрацоўчых прылад для пракладкі мінералізаваных палос. Для ранняга выяўлення лясных пажараў створана сетка з прыкладна 620 пажарна-назіральнымі вышкамі і мачтамі, з іх звыш 530 абсталяваны сродкамі відэаназірання.

У Беларусі ўстанавілася анамальна гарачае надвор'е з тэмпературным фонам значна вышэй за кліматычную норму, што абумовіла павышэнне ўзроўню пажарнай небяспекі. Спякота захаваецца да канца тыдня. Будзе пераважна без ападкаў, магчымыя толькі невялікія дажджы лакальнага характару. Аранжавы ўзровень небяспекі з-за спякоты аб'яўлены ў Беларусі да 15 чэрвеня.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Сугучча

# КНІГІ, ЯКІЯ ПЕРАМАГАЮЦЬ

**Рэкордны «ўраджай» дыпломаў сабралі беларускія кнігі на XVI Міжнародным конкурсе дзяржаў — удзельніц СНД «Мастацтва кнігі», які прайшоў у Баку 30—31 мая. Выдаўцы з нашай краіны атрымалі 20 узнагарод, у тым ліку Гран-пры — яго прысудзілі 3-томнай персанальнай энцыклапедыі «Янка Купала».**

Гэты фундаментальны выдавецкі праект, які здзейсніла выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» ў шчыльнай звязцы з літаратурным музеем Янкі Купалы, уключае больш за 3000 ілюстрацый і каля 9000 навуковых артыкулаў, а таксама без перабольшання ўнікальныя матэрыялы: партрэт беларускага класіка работы кітайскага мастака Ао Тэ, звесткі пра перакладчыкаў твораў Купалы на рускую, казахскую, грузінскую, балгарскую, татарскую і іншыя мовы, даследаванні ўплыву творчасці песняра на ўсходнюю і англамоўную літаратуру і г. д. Канкурэнцыю беларускаму выданню складала, між іншым, 35-томная «Расійская энцыклапедыя» — і ўсё ж перамога засталася за нашымі выдаўцамі.

Сёлета ў конкурсе ўдзельнічала больш за 80 выданняў з сямі краін СНД: Азербайджана, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана і Туркменістана. Беларускія выдаўцы прадставілі на суд журы 31 кнігу па 11 намінацыях: «Садружнасць», «Мая краіна», «Кніга для дзяцей і юнацтва», «Дыялог культур», «Навука і інавацыі», «Навуковая літаратура і адукацыя», «Арт-кніга», «Аддрукавана ў Садружнасці», «Мастацтва ілюстрацыі», «Перамога» і «Гран-пры».

«Па кожнай кнізе кожнай краіны ішло сур'ёзнае абмеркаванне і галасаванне, у складзе журы працавалі прадстаўнікі профільных міністэрстваў, кніжнага гандлю, выдаўцы, таму барацьба была сапраўды складаная і творчая, — падзяліўся ўражаннямі **дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір АНДРЫЕВІЧ**, які ўваходзіў у склад беларускай дэлегацыі. — Але магу сказаць, што нашы кнігі вылучаліся сярод іншых не толькі дызайнам, якаснай паліграфіяй, але і сваёй сацыяльнай скіраванасцю і глыбокім навуковым падыходам. Магчыма, таму сёлета мы прывезлі як ніколі шмат узнагарод».



Па выніках конкурсу кнігі, якія прадставіла Беларусь, заваявалі 20 прызавых месцаў: Гран-пры, восем першых, два другія, а таксама дзевяць спецыяльных дыпломаў. Напрыклад, праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Першы буквар. Факсімільнае ўзнаўленне» атрымаў дыплом «Жамчужына культурнай спадчыны».

Прыемна, што ёсць сярод прызёраў і кнігі Выдавецкага дома «Звязда» — у намінацыі «Садружнасць» дыплом другой ступені прысуджаны зборніку «З Бацькаўшчынай у сэрцы», а ў намінацыі «Арт-кніга» спецыяльным дыпломам адзначана выданне «Акварэльны сусвет Вячаслава Паўлаўца».



Міністэрства інфармацыі Беларусі адзначыла падзякамі і граматамі за асабісты ўнёсак у кнігавыдавецкую справу шэраг айчынных мастакоў-ілюстратараў, рэдактараў і выдаўцоў, у тым ліку і **кіраўніка Выдавецкага дома «Звязда» Паўла СУХАРУКАВА *(на фота)*.** А дыпломы пераможцам конкурсу па традыцыі будуць уручаны ў верасні, падчас Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Таксама бліжэй пазнаёміцца з выданнямі — пераможцамі міжнароднага і нацыянальнага конкурсаў «Мастацтва кнігі» — можна будзе на святкаванні Дня беларускага пісьменства ў Слоніме.

### Дарэчы

Як адзначыла **начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Беларусі Алена ПАЎЛАВА**, за шаснаццаць гадоў правядзення міжнароднага конкурсу дзяржаў — удзельніц СНД «Мастацтва кнігі» Беларусь лідзіруе па колькасці атрыманых Гран-пры — найвышэйшых узнагарод у нас ажно дзевяць. Наогул за гэты час айчынныя выдаўцы прадставілі на суд прафесіяналаў з краін СНД больш чым 2000 кніг і атрымалі 151 дыплом рознай вартасці.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

# АНЁЛ-АХОЎНІК ДЛЯ КАЦІ...



**Каця стала ахоўнікам адначасова для ўсіх катоў.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Напэўна, імя спрацавала, — смяецца Кацярына. — Калі я прынесла яе да ветэрынара, першае, пра што ў мяне спыталіся, — як яе імя. Я спачатку разгубілася, а потым выпаліла — Каця. Маўляў, ёй зараз не хапае здароўя, а ў мяне з гэтым усё ў парадку. Праз некаторы час сяброўка, якая не ведала, што я дала кошцы свае імя, назвала яе Кацяй ужо ў другой клініцы. Адным словам, у кошкі такі лёс — быць Кацяй.

Бедная жывёліне даводзілася ставіць зонд: самастойна есці яна не магла. Пад кантролем сваёй цёзкі яна хутка аднавіла сілы. А нядаўна пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў добрую сям'ю. Хэпі-энд, заслона, апладысменты... Такіх аптымістычных гісторый Каця можа расказаць шмат. Апошнія шэсць гадоў яна толькі і займаецца тым, што ратуе хворых катоў і знаходзіць для іх сем'і. А ўсё пачалося раптоўна.

— У мяне жыў кот, і я нават не думала пра тое, што яны могуць хварэць. За пятнаццаць гадоў яго жыцця я толькі два разы была ў ветэрынара, — расказвае яна. — На вуліцах яго суродзічаў наогул не звяртала ўвагі. Мне здавалася, што катам патрэбна толькі ежа і болей нічога. Але аднойчы я падабрала на вуліцы маленькае бездапаможнае кацяня, якое памірала, і прынесла дадому. Як потым высветлілася, яно хварэла на каліцывірус (распаўсюджаная кацiная хвароба) і заразіла майго ката. Мы позна ўбачылі гэта, і выратаваць яго не атрымалася. Гэта было вялікае гора для мяне. І я вырашыла: кацяня крыху падрасце, я яго аддам, і болей катоў у мяне не будзе. Але ўслед за Сарачкай, так мы яе назвалі, з'явіўся кот ж хворы Сцёпачка. На яго жахліва было глядзець — знясілены, з кучай блох. У клініцы сказалі, што без аперацыі на вачах не абысціся, бо ў яго яны ўжо амаль не адкрываліся. І мы пайшлі на гэта. Паўгода няньчыліся з двума катамі, а потым сталі з'яўляцца новыя з ліку хворых, траўмаваных, атручаных.

## БРАТЫ НАШЫ МЕНШЫЯ, ПРАБАЧЦЕ НАС

А вось гэты выпадак зусім з іншай плоскасці. Гадоў дзесяць, а можа і болей, у Магілёве судзілі маладых хлопцаў, якія здзекаваліся з катоў і здымалі ўвесь гэты трэш на відэа. Спачатку з экрана глядзяць спалоханыя вочы адлоўленага ў падваротні маленькага кацяняці. Праз некалькі секундаў яго разрывае чалавечая рука і на далоні жахліва пульсуе акрываўленае сэрца...

Адзін з апошніх пастаяльцаў Каці — Саня, рыжы кот без хваста. Ветэрынары паглядзелі яго і сказалі, што нехта выдраў хвост з хрыбетніка. Не проста прыціснуў дзвярыма, а рвануў са ўсяго дуру.

Не знайшоўся пакуль гаспадар і для Оскара, які на выхаванні Каці. Ён прыгожы, але адна лапа бяздзейнічае. Кату перабілі наогул дзве і знявечылі так, што ветэрынары тры гадзіны збіралі яго па запчастках.

Бадзяжныя жывёлы рэдка бываюць здаровымі. Панлейкапенія, вірусны перытаніт, каліцывірусе — ад адных назваў гэтых распаўсюджаных сярод бяздомных катоў і сабак хвароб робіцца дрэнна. Кацярына ж вымаўляе іх без запінкі. І вельмі ўдзячная сваёй сяброўцы Святлане, якая дапамагае ёй лячыць. Святлана — дыпламаваны спецыяліст па ветэрынарыі.

— Севу мы вярнулі, лічы, з таго свету, ад яго адмовіліся нават ветэрынары, — расказвае Каця пра яшчэ аднаго свайго гадаванца. — У яго не працаваў страўнік. Месяц змагаліся, і ён выжыў. Але пасля гэтага стаў есці толькі варанае мяса. Ніхто не хоча моцна траціцца на ката. Таму ён у нас і застаўся.

## УСЯ ЗАРПЛАТА НА КАТОЎ

Ратаваць катоў для суразмоўцы — справа жыцця. Праўда, абыходзіцца гэта нятанна. «Толькі адных кармоў купляю штомесяц на 200 рублёў, а калі нехта захварэе, трэба каравул, — прызнаецца Каця. — Праз таварыства «Добрае сэрца» шукаем спонсараў. Дзякуючы арганізацыі можна эканоміць на нейкіх аперацыях, стэрылізацыі. За грошы таварыства мы стэрылізавалі кошак з некалькіх бліжэйшых двароў. Увосень людзі зноў пачнуць выкідаць з дамоў сваіх гадаванцаў, і ўсё пачнецца зноў. Гэтыя няшчасныя жывёлы ходзяць, хварэюць, пакуль не памруць або пакуль такія, як мы, не возьмуць іх да сябе дамоў.

— Дрэнна, калі праблемай бадзяжных жывёл павінны займацца выключна валанцёры, — кідае сяброўка Кацярыны Святлана. — Адзін у полі не воін. У нас у горадзе ёсць толькі «перэтрымкі» і «Спецаўтапрадпрыемства», дзе іх усыпляюць. Што тут казаць, калі свядомасць грамадзян нізкая, калі яны не разумеюць элементарных рэчаў, важнасць той жа стэрылізацыі. Нам, каб стэрылізаваць дзесяць кошак на месяц, трэба цэлую зарплату пакласці. Клінік, якія робяць гэта бясплатна, у Магілёве няма. Хоць гэта сацыяльная праблема.

«Дзясяткі паездак да ветаў і «гігабайты» цярпення, пошук гаспадароў і — ура! Яны знайшліся». Гэтыя аптымістычныя радкі з сайта магілёўскага таварыства абароны жывёл «Добрае сэрца». Грамадская арганізацыя аб'ядноўвае валанцёраў накшталт Кацярыны і Святланы, якія добраахвотна дапамагаюць па магчымасці бадзяжным жывёлам. Усе каты і сабакі, прадстаўленыя на сайце, жывуць на «перэтрымцы». Яны рэабілітаваныя, прайшлі медыцынскі агляд, іншыя неабходныя прафілактычныя працэдуры. На жаль, не ўсе жывёлы прышчапляюцца, бо не хапае сродкаў на вакцынацыю. Гэтая працэдура ўскладаецца на будучых гаспадароў. Нельга без слёз глядзець на асаблівых выхаванцаў, працей кажучы інвалідаў. Кот у падгузніку, таму што ў яго пераломлены хрыбетнік і ён не можа кантраляваць свой стул, кацяня без вока — яны таксама шукаюць сабе дом і абяцаюць любіць сваіх гаспадароў. І шчаслівыя паведамленні: «Гром дома!», «Света дома!», «Умка, Аляска, Сцеша, Віні, Машанька, Вара дома» — усяляюць надзею, што працуюць валанцёры недарэмна. Знаходзяцца людзі, якія ахвяруюць грошы, дапамагаюць прадуктамі, робяць за свой кошт аперацыі, але такіх прыкладаў, на жаль, мала.

Цікава, што нашымі бадзяжкамі болей цікавяцца іншаземцы. Прыгожы шэры кот Філіп, які пакуль жыве ў Каці, сёмага ліпеня ляціць на самалёце ў Германію. Ён ужо і з дакументамі, і з прышчэпкамі. Яшчэ адну Каціну кошку забрала сям'я з Франкфурта-на-Майне.

## ГЭТА ЯШЧЭ І НЕБЯСПЕЧНА

Пра тое, што праблема бадзяжных жывёл стаіць востра, кажуць і работнікі магілёўскага «Спецаўтапрадпрыемства».

— Рэгістрацыя жывёл у Магілёве ідзе вельмі марудна, — кажа **намеснік дырэктара Валянціна ПЛЕСКАЧОВА**. — На сённяшні дзень зарэгістравана толькі 150 сабак. А колькі іх жыве ў прыватным сектары, ніхто не скажа. Што датычыцца катоў, то іх наогул ніхто не рэгіструе. У выніку бадзяжных жывёл меней не робіцца.

На прадпрыемстве ёсць некалькі вальераў для часовага ўтрымання сабак. Але тут яны могуць знаходзіцца не болей пяці дзён. І гаспадар, калі ён знойдзецца, павінен кампенсаваць выдаткі на ўтрыманне. Мая суразмоўніца згадала толькі адзін выпадак, калі адлоўлены сабака быў зарэгістраваны і з жэтонам, па якім і знайшлі гаспадара.

На жаль, адсутнасць парадку з улікам жывёл прыводзіць да вельмі непрыемных наступстваў. У Магілёўскім раёне нядаўна быў выпадак, калі дзяўчынку пакусаў сабака. Калі яго праверылі, ён аказаўся хворы на шаленства.

## ТЫМ ЧАСАМ

У магілёўскай школе № 34 вырашылі знайсці выйсце з праблемы. Тут напісалі цэлую даследчую работу наконт бадзяжных жывёл і нават зрабілі катадом.

— Мы прачыталі, што ў адным з беларускіх гарадоў з дапамогай міжнароднай арганізацыі такі катадом усталявалі, — расказвае **настаўніца пачатковых класаў Вольга ПЯТРОВА**. — Мы вырашылі паўтарыць гэты прыклад. Разам з вучаніцамі другога і чацвёртага класаў правялі даследаванне і нават з іншымі вучнямі чацвёртага і другога класаў хадзілі да валанцёраў арганізацыі «Добрае сэрца». Праблема сапраўды вельмі вострая. Але калі мы зрабілі катадом, высветлілася, што паставіць яго ў горадзе няма дзе: парушаюцца саннормы.

Атрымліваецца парадокс: бадзяжныя жывёлы ёсць, а ствараць ім умовы жыцця нельга. У выніку катадом прапісаўся на тэрыторыі прыватнага домаўладання. А праблема так і засталася.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

13 ЧЭРВЕНЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 10 (15865)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года


*Імёны*

## Міхаіл ВАЙЦЮК:

# «ПА ЗВАННІ Ў ГОРЫ НЕ ХОДЗЯЦЬ»



**Міхаіл Вайцюк у складзе каманды беларускіх альпіністаў падняў агонь II Еўрапейскіх гульняў на найвышэйшую кропку Еўропы — вяршыню Манблан. За 14 гадоў заняткаў горным турызмам скарыў больш за 30 вяршыняў, да прэстыжнага звання «Снежны барс» Міхаілу не хапае ўсяго аднаго сямітысячніка. Самая высокая кропка, дзе пабываў хлопец, — 7495 метраў. Сёння горны турызм для 31-гадовага маладога чалавека — хобі, якое з'явілася яшчэ на першым курсе ўніверсітэта і не згубілася ў паўсядзённай мітусні сямейнага жыцця. Пра ўзыходжанне на Манблан з «Полымем міру», пра тое, што павінна знаходзіцца ў заплечніку альпініста і што самае галоўнае пры скарэнні вяршыняў, наш герой расказаў у сваім інтэрв'ю.**

**— Вы памятаеце сваё самае першае ўзыходжанне?**

— Гэта было летам 2007 года, я паехаў са старэйшымі таварышамі на Каўказ, праўда, як называлася вяршыня і яе вышыню ўжо не назаву. Калі адным словам апісаць тое адчуванне — было цікава. А калі казаць пра маё першае значнае дасягненне, то гэта быў лыжны паход па Хібінах на Кольскім паўвостраве. Было падарожжа чацвёртай катэгорыі складанасці, за два тыдні мы прайшлі на лыжах 300 кіламетраў.

**— З якімі складанасцямі звычайна даводзіцца сутыкацца?**

— Напэўна, перш за ўсё яны датычацца працяглага знаходжання ў гарах. У апошні год я хаджу ў вышынныя паходы, якія доўжацца ад 30 да 45 дзён. Гэта звязана з тым, што трэба акліматызавацца, каб падняцца на сямітысячнік. За 15-16 дзён арганізм павінен асвоіцца, падрыхтавацца да вышыннага маршруту, а далей пачынаецца самае цікавае — узыходжанне. Свае карэктывы можа ўнесці надвор'е, наогул ад яго шмат што залежыць.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Не вучобай адзінай*

# САКРЭТЫ ШЧАСЦЯ СТУДЭНЦКАЙ СЯМ'І

**Даша і Кірыл БУТАРАВЫ — пераможцы сёлетняга рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх сем'яў «Шчаслівыя разам». Мы сустрэліся з маладой парай за кубачкам гарбаты і паразмаўлялі пра ўзаемаразуменне, сумесны быт і, канешне, каханне.**

— Як жыццё сямейнае? — пытаюся ў Кірыла.

— Калі працуеш і вучышся, яно і незаўважна, — усміхаецца. — Позна прыйшоў дадому, павячэраў і спаць. Ранкам зноў за справы. Затое не паспяваем адно аднаму надакучыць!

— Пасля штампа ў пашпарце нічога не мяняецца. Адзінае, у мяне з'явіўся такі козыр, як фраза «Я ж твая жонка!». Праўда, рэдка ім карыстаюся — не працуе, — разводзіць рукамі Даша.

Яна родам з Бабруйска, бацькі Кірыла жывуць у Кіраўску. Так, паміж двума населенымі пунктамі, у загараднай кавярні, пара вяселле мінулым летам і адгуляла.

— Я прыйшоў з сябрам у суседні інтэрнат, дзе жыла Даша, гуляць у «Мафію». Апынуліся з ёй у адной кампаніі, пазнаёміліся, — успамінае Кірыл. — Пачуцці з'явіліся праз некалькі такіх сустрэч за гульнёй. Далей — кветкі, кіно, спатканні. Усё па класіцы.

— Кірыл зрабіў мне прапанову на мой дзень нараджэння. Амаль праз год пасля знаёмства, — расказвае дзяўчына. — Хваляваўся страшэнна! Цэлы дзень хадзіў сам не свой. Я не разумела, што не так, у чым справа? Выдыхнуў, павесялеў жаніх толькі пасля таго, як падарыў пярсцёнак.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Рамана РУЦКАГА.

*Усё — у тваіх руках!*

# ЯК ЗАГАРТОЎВАЮЦЬ... «КАРАЛЕЎ»

## І што іх чакае наперадзе

**Сярод 13 дзяўчат з розных ВНУ, якія прадставілі гледачам і журы свае таленты ў фінале рэспубліканскага конкурсу грацыі і артыстычнага майстэрства «Каралева-вясна — 2019», найлепшай па выніках галасавання стала студэнтка Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Таццяна ШЧЭРБАЧ. Яна расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене», як праходзіла гэта творчае спаборніцтва і чаму яе навучыла.**



**— Таня, мяркуючы па тваіх фатаграфіях у сацсетках, ты даволі актыўны чалавек!**

— Гэта так. Я танцую, спяваю, малюю, іграю на фартэпіяна. Яшчэ ў дзяцінстве бацькі зразумелі, што я — неспакойная дачка, якая не любіць сядзець на адным месцы, таму імкнуліся заняць мяне нечым. Жаданне развівацца ў розных кірунках засталося дагэтуль, таму зараз пастаянна ўдасканальваю свае ўменні.

**— Ты вучышся на першым курсе педагагічнага факультэта на лагапеда. Што паўплывала на выбар прафесіі?**

— Я лічу сябе хатняй дзяўчынай, таму засталася разам з сям'ёй у Гродне. Да таго ж, мая мама — педагог-лагапед. Ні на хвіліну не сумнявалася ў правільнасці свайго выбару спецыяльнасці. Мне падабаецца, якія веды атрымліваю ва ўніверсітэце кожны дзень.

**— Колькі часу сышло на роздум, ці прымаць удзел у конкурсе «Каралева-вясна — 2019»?**

— Гэта было спантаннае рашэнне. Шчыра кажучы, заўсёды была далёкая ад такога кшталту конкурсаў, таму падобны вопыт для мяне першы. Але знаёмыя і родныя не раз намякалі, што варта было б паспрабаваць, і я пагадзілася: «А чаму б і не?». Першы кастынг прайшоў яшчэ ў снежні, тады арганізатары конкурсу толькі ацэньвалі знешнія даныя тых, хто прыйшоў. У выніку трапіла ў фінал універсітэцкага этапа, чаму была вельмі рада. Падрыхтоўка да яго доўжылася тры месяцы, да абласнога, які праходзіў у красавіку, — некалькі тыдняў, а да рэспубліканскага — усяго тыдзень. Гэта быў выклік самой сабе: даказаць, што я здольная на многае, не наведваючы дагэтуль мадэльную школу і не ўдзельнічаючы ў ніякіх фотасесіях.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 06 2019 г.

З базай у галаве

# ПРАГРАМІСТЫ, ТЭСЦІРОЎШЧЫКІ, БІЗНЕС-АНАЛІТЫКІ...

## Якім яшчэ спецыялістам знойдзецца месца ў IT?



**По звестках вядомай кансалтынгавай кампаніі McKinsey, у наступныя 20 гадоў да 50 % рабочых аперацый могуць быць аўтаматызаваныя. Ужо складзены спіс спецыяльнасцяў, якія з верагоднасцю больш як 97 % знікнуць у найбліжэйшыя 15 гадоў. Разам з тым ёсць і аптымістычны сцэнарый. Эксперты сцвярджаюць, што ўкараненне інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі створыць шмат новых прафесій.**

**«Выбраць свой прафесійны шлях абітурыенту сёння надзвычай складана, але дакладна можна сказаць, што ў эпоху рабатызацыі і актыўнага ўкаранення інфармацыйных тэхналогій IT-спецыялісты будуць востра запатрабаваныя. Для нашай галіны ўсе перамены, што адбываюцца ў свеце, азначаюць толькі адно — мы будзем забяспечаны работай...», — падкрэслівае намеснік дырэктара адміністрацыі ПВТ Аляксандр МАРЦІНКЕВІЧ. — Па статыстыцы, на канец сакавіка ў Парку працавала больш як 45 тысяч чалавек, пры гэтым за апошнія тры гады было створана 19 тысяч новых рабочых месцаў (2285 — толькі за першы квартал бягучага года).**

**Штогод у кампаніі-рэзідэнты ПВТ уладкоўваецца больш як 1,5 тысячы выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі. Якімі ведамі і кампетэнцыямі павінны валодаць спецыялісты, што мараць трапіць працаваць у Парк? Каго будуць рады бачыць у сябе наймальнікі? Як палепшыць практычны складнік падрыхтоўкі будучых «айцішнікаў»? Пра ўсё гэта ішла гаворка падчас круглага стала, які адбыўся напярэдадні старту прыёмнай кампаніі ў бізнес-інкубатары Парка высокіх тэхналогій.**

### Стаўка на ўнікальнасць

На жаль, зрабіць доўгатэрміновы прагноз аб тым, якія менавіта IT-спецыялісты будуць на хвалі попыту праз чатыры гады, ніхто не адважваецца.

— Бывае, што нейкая новая тэхналогія стварае патрэбу ў кадрах на працягу паўгода, але неабходнасць у пэўных спецыялістах можа хутка ўзнікнуць і гэтаксама хутка знікнуць, — канстатуе **начальнік аддзела падрыхтоўкі кадраў «Эпам Сістэмз» Яўген ПЕШКУР.** — На працягу прыкладна пятнаццаці апошніх гадоў я назіраў цікавы эфект: спецыялісты навучаліся матэматыцы, біялогіі, хіміі, фізіцы, радыёфізіцы, электроніцы, а потым пайшлі праграмаваць. На некалькі гадоў яны забыліся пра сваю першую спецыяльнасць, за гэты час набраліся вопыту ў іншай, новай для іх сферы дзейнасці. А калі беларускім IT-кампаніям пачалі даваць высокатэхналагічныя праекты, аказалася, што толькі ведаў у праграмаванні ўжо недастаткова — каб выканаць пастаўленую задачу, трэба адначасова разбірацца ў іншых сферах. І вось тут веды гэтых людзей аказаліся запатрабаванымі. Я ведаю шмат прыкладаў, калі пасляховымі IT-спецыялістамі сталі тыя, хто здолеў сумяшчаць практычна дзве-тры прафесіі.

Калі малады чалавек хоча зазірнуць больш чым на пяць гадоў наперад, то, я лічу, ён павінен падумаць пра спецыяльнасць, якая ў камбінацыі з праграмаваннем зробіць з яго дастаткова ўнікальнага спецыяліста. Прышчапіць IT-кампетэнцыі спецыялісту ў прыродазнаўчанавуковай, тэхнічнай галіне прасцей, чым наадварот.

Напрыклад, выпускнікі Лінгвістычнага ўніверсітэта выдатна разумеюць структуру мовы, займаюцца лінгвістычным аналізам і могуць разабраць, якія словы ўяўляюць цікавасць для камп'ютарнай праграмы. Цяпер такія спецыялісты патрэбныя, як паветра.

**Вынікі апытання рэзідэнтаў ПВТ паказваюць, што ў 2019 годзе IT-кампаніі прымуць на работу найбольшую колькасць тых выпускнікоў ВНУ, якія праграмуюць на JavaScript, Java, C#/ .NET, PHP, Python, Swift, C++, Ruby/ Rails, Objective-C, Kotlin.**

**Запатрабаванымі з'яўляюцца таксама распрацоўшчыкі, якія працуюць у сферах вялікіх даных, машыннага навучання.**

А ў кароткатэрміновай перспектыве (найбліжэйшыя тры-пяць гадоў) будуць запатрабаваныя распрацоўшчыкі. Выбірайце любую папулярную мову праграмавання — і не памыліцеся. Другая група — людзі, якія дапамагаюць праграмістам: бізнес-аналітыкі, тэсціроўшчыкі і г. д. Трэцяя — спецыялісты, якія займаюцца апрацоўкай даных.

### Фундаментальны бэкграўнд

— Попыт на распрацоўшчыкаў і вопытных тэсціроўшчыкаў будзе заўсёды, я маю на ўвазе спецыялістаў, здольных не проста пісаць код, а комплексна глядзець на праблемы бізнесу і прапаноўваць адпаведныя рашэнні, — падтрымлівае калегу **спецыяліст па падрыхтоўцы кадраў ТАА «Тэхартгруп» Таццяна ЕРМАЛІНСКАЯ.** — Для гэтага патрабуецца моцная інжынерная падрыхтоўка, добры фундаментальны бэкграўнд і, калі не наяўнасць дадатковай спецыяльнасці, каб стаць унікальным прафесіяналам, то прынамсі шырокая эрудыцыя і ўласны пункт гледжання для таго, каб быць эфектыўным. Заўсёды будуць цаніцца спецыялісты з фундаментальнымі ведамі, добрым узроўнем валодання англійскай мовай, жаданнем вывучаць новае і хутка адаптавацца пад усе змяненні і новыя патрэбы.

У ПВТ канстатуюць: імклівы рост IT-галіны азначае, што ў ёй знойдзецца месца не толькі тэхнічным спецыялістам. Парк гэта вельмі востра адчуў, калі яго рэзідэнты, акрамя выканання распрацовак на заказ, пачалі ствараць уласныя прадукты, у тым ліку вядомыя ва ўсім свеце. Адпаведна хутка вырас попыт на прадуктовых маркетолагаў, дызайнераў, эканамістаў і іншых «гуманітарыяў», да таго ж практыка паказала, што з «гуманітарыяў» атрымліваюцца выдатныя «тэхнічныя пісьменнікі», бізнес-аналітыкі, спецыялісты па найме і рабоце з персаналам. Так што неабходнасць быць «сухім тэхнаром», каб пасляхова працаваць у IT-галіне, — гэта міф. Памылковым з'яўляецца таксама меркаванне, што IT-галіна — не для жанчын. Насамрэч, у некаторых прафесій (бізнес-аналітык, «тэхнічны пісьменнік» і тэсціроўшчык) у ПВТ, хутчэй, жаночае аблічча. Увогуле сярод супрацоўнікаў кампаній-рэзідэнтаў ПВТ доля жанчын складае 34 працэнты.

Што датычыцца ведання англійскай мовы, то яе трэба вывучаць у любым выпадку. Каб не адстаць у плане тэхналогій, IT-спецыялісту жыццёва неабходна пастаянна вучыцца, а навейшыя веды даступныя менавіта на англійскай мове. Адсутнасць мовы не даруюць, нават калі вы геніяльны тэсціроўшчык, аналітык ды г. д., і надзвычай малы шанц, што вы атрымаеце работу.

— Мовы праграмавання становяцца ўсё больш простымі і зразумелымі для старту, для таго, каб проста пачаць кадзіраваць. І ў абітурыентаў гэта стварае ілюзію лёгкага ўваходу ў спецыяльнасць, — канстатуе **прарэктар па вучэбнай рабоце БДУІР Валерый ПРЫТКОЎ.** — Але, каб працаваць над сур'ёзнымі праектамі, патрэбны комплексныя веды. Таму неабходна арыентаваць моладзь на тое, што ім давядзецца пастаянна дабіраць веды. А нам важна захаваць тую частку фундаментальнай падрыхтоўкі, якая дазволіць выпускнікам у будучыні самім гнутка перабудоўвацца пад тэхналогіі, якія будуць узнікаць. Даючы больш фундаментальнай падрыхтоўкі, мы даём менш канкрэтных ведаў, таму тут, як заўсёды, важны баланс, і ў кожнага ўніверсітэта ён свой.

Зараз мы стараемся максімальна выкарыстоўваць напрацоўкі, якія ёсць у IT-кампаніях, для навучання студэнтаў. У нас ёсць свае курсы, якія распрацаваны нашымі выкладчыкамі, многія IT-кампаніі таксама маюць курсы пад свае тэхналогіі і праекты. Чаму б не інтэграваць іх у працэс навучання? Напэўна, гэта магчыма, тым больш што праграмы ў прынцыпе падобныя. Таксама нам цікава паспрабаваць і ў нейкай меры рэалізаваць наступную ідэю: дазволіць студэнтам частку дысцыплін вывучаць з дапамогай дыстанцыйных тэхналогій, каб не ўвесь час яны знаходзіліся ў аўдыторыі.

### І зноў пра фізіку...

— Усе сыходзяцца ў думцы, што на першае месца выходзіць фундаментальная адукацыя. У той жа час большасць школьнікаў заяўляюць, што фізіка — надзвычай складаны прадмет, і не гараць жаданнем у яго паглыбляцца, — заўважае Аляксандр Марцінкевіч. — А мы на сваім вопыце пераканаліся, што спецыялісты, якія вывучалі фізіку, больш пасляховыя. Параўноўвалі выпускнікоў кірунку «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі», якія пры паступленні не здавалі фізіку, і тых, што здавалі. «Якасць» апошніх была істотна вышэйшая. Таму мы настойліва раім школьнікам: калі яны хочуць быць добрымі IT-спецыялістамі, фізіку абавязкова трэба вывучаць. Фізіка, як і матэматыка, з'яўляецца падмуркам для атрымання інжынернай адукацыі.

**Дэкан факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ Сяргей МАЛЫ** заўважае: «Выдзяляць IT-спецыялістаў у асобную касту, я лічу, не зусім правільна. Важнае значэнне на любой спецыяльнасці мае сістэмнасць базавай падрыхтоўкі і набор вучэбных дысцыплін: наколькі добра яны збалансаваныя паміж сабой і ці захаваюць актуальнасць у будучыні? Працягласць выкарыстання фундаментальных ведаў самая высокая.

З вопыту нашага факультэта скажу, што збалансаванае аб'яднанне фізікі, матэматыкі, электронікі і інфарматыкі дазваляе выпускнікам дастаткова камфортна адчуваць сябе, незалежна ад змен, што адбываюцца на рынку працы. Як бы шчыльна і інтэнсіўна мы ні ўзаемадзейнічалі з IT-кампаніямі, нашы тактычныя задачы адрозніваюцца. Напрыклад, кампанія, якая з'яўляецца сусветным лідарам у нейкай вузкай вобласці, не будзе тыражаваць масава тыя веды і кампетэнцыі, што ўтвараюць аснову яе лідарства. Аднак яна з задавальненнем навучыць чалавека, які прыйдзе да іх працаваць, усім патрэбным нюансам.

Для вырашэння актуальных задач важна ведаць не толькі фізіку, матэматыку, асновы праграмавання, інфармацыйных тэхналогій, а яшчэ і валодаць сістэмным мысленнем. Перавага фізікаў у рэалізацыі сістэмнага падыходу да рашэння любой праблемы відавочная».

### Прафесійная гнуткасць

— Мы не рыхтуем і ніколі не будзем рыхтаваць праграмістаў — для гэтага ёсць БДУ і БДУІР, — падкрэслівае **прарэктар па вучэбнай рабоце Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Андрэй СЕДУН.** — У нас задача іншая — выпускаць эканамістаў з глыбокімі ведамі IT-сферы і інструментарыю, які яны змогуць прымяняць у сваіх галінах: гэта могуць быць фінансы, гандаль, маркетынг, міжнародныя бізнес-камунікацыі, гаспадарчае права... Яны маюць істотную перавагу: могуць працаваць не толькі ў IT-кампаніях, а ў любых сферах дзейнасці. Але мы думаем, што прыйшоў час узмацніць падрыхтоўку, таму было прынята рашэнне аб стварэнні ва ўніверсітэце з 1 жніўня факультэта лічбавай эканомікі. На ім будуць рыхтаваць па спецыяльнасцях «Эканамічная інфарматыка», «Эканамічная кібернетыка» і «Статыстыка». Гэта тыя кірункі, якія ў найбольшай ступені інтэграваныя ў нас у IT. Згаданы факультэт будзе адказваць за IT-падрыхтоўку будучых спецыялістаў таксама з іншых падраздзяленняў універсітэта.

**Больш як 2,5 тысячы студэнтаў ВНУ цяпер навучаюцца і адначасова працуюць у ПВТ. Штогод стажыроўку ў кампаніях-рэзідэнтах ПВТ праходзіць больш за тысячу студэнтаў.**

Між іншым, некаторыя наймальнікі лічаць, што тэхнічныя кампетэнцыі сёння адыходзяць на другі план, а на першы выходзяць асобасныя характарыстыкі работнікаў, бо, спалучаючы добрую фундаментальную падрыхтоўку з практыкай, можна ў экспрэс-рэжыме атрымаць вельмі добрых спецыялістаў (аднак гэта магчыма толькі пры ўмове іх асабістай зацікаўленасці). Патрэбныя тэхнічныя кампетэнцыі сфарміруюцца ўжо на рабочым месцы: куды больш важна атрымаць матываваных і адказных людзей.

Якія яшчэ важныя якасці, якія яны хочуць бачыць у сваіх работніках, называюць работадаўцы? Камунікатыўнасць, эмацыянальны інтэлект, уменне слухаць суразмоўніка, дакладна адказваць на пытанні і не расцякацца думкай. Сістэмнасць мыслення: спачатку падумай, потым выбірай інструмент і рабі! Гнуткасць у прафесійным развіцці і гатоўнасць пастаянна вучыцца. Матывацыя да развіцця. Уменне працаваць у камандзе: можна набраць шмат «зорак», якія будуць цягнуць воз у розныя бакі і не змогуць зрабіць свой унёсак у агульны вынік.

— Звязваючы сваё жыццё з IT, трэба разумець, што працаваць прыйдзецца зусім не па той спецыяльнасці, якую ты атрымліваў у ВНУ, а па сумежнай ці ўвогуле па нейкай новай, — заўважае Аляксандр Марцінкевіч. — IT-галіна — вельмі гнуткая, і работніку трэба быць пастаянна гатовым вывучаць новыя тэхналогіі і нават перакваліфікавацца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Нябачныя масты*

# ЗА МАРАЙ У НЕЗНАЁМУЮ КРАІНУ БЕЛАРУСЬ

**Студэнты — той ключавы складнік, без якога ніводная ВНУ не змагла б паўнавартасна функцыянаваць. У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце гэта не толькі беларускія хлопцы і дзяўчаты, але і шматлікія замежнікі. Уявіце, як адчуваюць сябе тыя, хто пераехаў не проста ў іншы горад, а ў іншую краіну! Усё незнаёмае, нязведанае... Давайце даведаемся пра іх уражанні з першых вуснаў. Першы і трэці суразмоўнікі — студэнты другога курса факультэта міжкультурных камунікацый і замежнага аддзялення перакладчыцкага факультэта адпаведна, астатнія рэспандэнты займаюцца на курсах рускай мовы для замежных грамадзян.**



**Ксенія Фаміна** прыехала да нас з паўночнага ўсходу Казахстана, горада Аксу. Пасыл зыходзіў ад яе бацькоў: маці дзяўчыны вельмі хацела жыць у Беларусі, бо гэта яе гістарычная радзіма. А выбар прафесіі і ВНУ цалкам лёг на плечы Ксеніі. Яе заўсёды прыцягвалі мовы.

— Спачатку я разглядала ўсю дэталёвую інфармацыю пра ВНУ, якія зацікавілі мяне, у інтэрнэце. — кажа дзяўчына.

— Там было мноства водгукаў рознага характару, але ў адносінах да МДЛУ добрых — нашмат больш. Я наведвала многія вышэйшыя навучальныя ўстановы, але ніяк не магла адчуць сябе на сваім месцы. Затое калі апынулася тут, зразумела, — маё!

Па-за вучобай Ксенія займаецца валанцёрствам: будзе працаваць добраахвотнікам на ІІ Еўрапейскіх гульнях у Мінску.



Акрамя сталіцы яна ўжо была ў Гродне, Магілёве і іншых гарадах. А ў першыя дні пасля прыезду агледзела амаль усе мясціны, якія раяць наведаць турыстам у Мінску. Самае першае з іх — музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны:

— Ён мяне ўразіў да глыбіні душы. Там ты нібыта дакранаешся да гісторыі, пачынаеш адчуваць сябе яе часткай.

**Робін Коскас Майсіс** з горада Манпелье, што знаходзіцца на поўдні Францыі, таксама паспеў наведаць значныя для яго мясціны ў Беларусі і расказаў нам пра адну з іх.

— Я быў у Барысаве, бо вельмі хацеў убачыць Бярэзіну. Гэта вельмі важная і знакамітая рака ў французскай гісторыі. Войскі Напалеона панеслі цяжкія страты падчас бязлітаснай бітвы на гэтай рацэ. З той пары назва «Berezina» выкарыстоўвалася ў французскай мове як сінонім слова «катастрофа», — кажа суразмоўнік.

Што яшчэ прываблівае хлопца ў нашай краіне? «У Беларусі мне вельмі падабаецца прырода, ландшафты проста ўражваюць. Я захапляюся лясамі! Яны таямнічыя і чароўныя... Мне падабаецца ваш народ, ваш менталітэт, адносіны адно да аднаго. Беларусы добрасардэчныя, таварыскія і ветлівыя».



А як жа не цікавіцца ў замежнікаў, ці спадабалася ім наша кухня? На гэтае пытанне з задавальненнем адказаў **Серхіа Анатоль Кабеса**, які прыехаў са сталіцы і найбуйнейшага горада Венесуэлы — Каракаса:

— Я пакаштаваў многія стравы беларускай кухні, і большасць з іх прыйшліся мне да смаку. Люблю і супы, і бліны, і салаты. Але больш за ўсё спадабаліся дранікі.

Серхіа Анатоль для атрымання адукацыі выбраў нашу краіну таму, што хацеў быць бліжэй да маці, якая ў той час працавала ў Беларусі. Яго цягнула да вывучэння моў, а для гэтага няма лепшага месца, чым лінгвістычны ўніверсітэт.



Зараз хлопец ужо асвоіўся і атрымлівае асалоду ад студэнцкага побыту. Апроч навучання малады чалавек вядзе актыўнае творчае жыццё ў сценах ВНУ: выконвае свае ўласныя песні і каверы на розных мерапрыемствах. Але, усё роўна не праходзіць ні дня, каб ён не сумаваў па радзіме.

Гэтае пачуццё падзяляе і **Алан Эмануэль Сота Рывера**, чый родны горад Тарыён размешчаны на поўначы Мексікі.

— Вядома, я сумую па тамтэйшых сябрах і, галоўным чынам, па нашай кухні. Аднак мне вельмі падабаецца жыццё ў Мінску. Ваша краіна моцна адрозніваецца ад Мексікі, і гэта прыцягвае яшчэ больш. Асабіста мне вельмі цікава знаёміцца з новай для сябе культурай, — сказаў Алан.

Тут ён знайшоў мноства новых сяброў і знаёмых, сярод іх як беларусы, так і замежнікі. Яго радуе той факт, што многія нашы суайчыннікі размаўляюць не толькі на знаёмай яму англійскай, але і на іспанскай — роднай мове маладога чалавека. У цэлым яго задавальняе ў навучанні ўсё.



— Так, сапраўды, выкладчыкі выдатныя, а ў дэканаце заўсёды дапамогуць вырашыць любую праблему, — пагадзіўся з Аланам і **Азгюр Махір Арас** са Стамбула. Пасля заканчэння там мясцовага ўніверсітэта малады чалавек захацеў вывучаць мовы. І вырашыў, што найлепш авалодаць імі можна ў прэстыжным лінгвістычным універсітэце нашай краіны. Юнаку падабаецца камунікаваць і праводзіць час са сваімі аднагрупнікамі. У Беларусі ён, як і астатнія іншаземцы, знайшоў добрых прыяцеляў і, як адзначыў хлопец, найлепшага і самага блізкага сябра — сваю дзяўчыну-беларуску.



Аднагрупніца Азгюра, **Фуку Накаяма**, прыехала з Кобу — аднаго з самых вялікіх і ажыўленых гарадоў Японіі. Раней дзяўчына не была ў Беларусі, аднак многае чула пра нашу краіну і навучанне тут ад японскіх таварышаў, якія займаліся ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.

— Аповеды знаёмых прыцягнулі і зацікавілі. Цяпер магу сказаць, што мне сапраўды вельмі падабаецца абраная ВНУ і навучанне ў ёй. Гэта так класна, калі я магу выкладаць свае думкі на іншай, не роднай для мяне мове. Хоць гэта яшчэ і атрымліваецца не вельмі добра. Пакуль не ведаю, кім хачу стаць у будучыні, але думаю, што навучанне ў Беларусі, атрыманыя тут веды і ўменні зробяць важны ўплыў на выбар прафесіі, — кажа дзяўчына.

**Надзея БОБРЫК, студэнтка І курса факультэта міжкультурных камунікацый МДЛУ.**

# САКРЭТЫ ШЧАСЦЯ СТУДЭНЦКАЙ СЯМ'І



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— Не хваляваўся я, — аднекваецца хлопец. — Усё было пад кантролем. Пра свой намер я за пару месяцаў да дня «Х» сказаў бацькам. Яны маё рашэнне падтрымалі. Пярсцёнак купіў ранкам перад работай. Увечары ўручыў. Мама, памятаю, раіла паднесці ўсё арыгінальна. Маўляў, дзяўчаты такое любяць: скрыначку пабольш схаваць у меншую скрыначку і гэтак некалькі разоў. «Не, — думаю, — перабор».

Сям'я студэнтаў вучыцца ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. Кірыл — на чацвёртым курсе на інжынера па аўтаматызацыі, Даша — у магістратуры. Абое на бюджэтнай форме. Працуюць у прыватных кампаніях. Ён — намеснік начальніка аддзела продажаў, яна — інжынер-эколаг:

— Мне падабаецца мая прафесія. Я складаю экалагічную дакументацыю для прадпрыемстваў, у якіх няма сваіх спецыялістаў. Гэта цікава! Увогуле, экалагічная сфера сёння вельмі запатрабаваная.

— Што самае смачнае гатуе жонка?

— Пельмені варыць! Жартую, — бярэ паўзу Кірыл. — У яе ўсё добра атрымліваецца! Локшына са сметанковым соусам, курыцай і грыбамі ў Дашыным выкананні — незямная страва!

— Муж дапамагае мне па хатняй гаспадарцы. Чысціць бульбу, мые посуд, прыбіраецца ў пакоі, — хваліць суджанага Даша. — Мне з'даецца, што Кірыл наўмысна не раскрывае ўсе свае таленты, каб я не пачала яго ва ўсім эксплуатаваць па поўнай праграме!

Сям'я жыве ў інтэрнаце ад роднага ўніверсітэта. Пакой маладым выдзелілі адразу, як яны афіцыйна ўзялі шлюб.

— Хто ў вашай сям'і галоўны?

— Кірыл зараз скажа, што ён. Але ж я ведаю, што я, — смяецца Даша. — Калі сур'ёзна, то амаль усе рашэнні мы прымаем разам. Адказнасць трэба дзяліць. Дарэчы, гэтыя цукеркі нам падарылі на конкурсе, — частуе прысмакамі.

— Мы не вельмі любім сцэну. Удзел у мерапрыемстве такога маштабу — сапраўды эксперымент для нашай сям'і. Першае месца — прыемная нечаканасць, — кажа Кірыл. — Увогуле, выходзіць з зоны камфорту часам карысна.

У спаборніцтве прынялі ўдзел пяць студэнцкіх сем'яў. Пары паказалі свае здольнасці ў спартыўным спаборніцтве, планавалі сямейны бюджэт, закуплялі прадукты для вячэры на вызначаную суму. Дзяўчаты гатавалі страву, а хлопцы сервіравалі стол. Сем'і прадставілі візітныя карткі, стыльныя family look, выступілі з творчымі нумарамі.

— Стол сервіраваць я, вядома, не ўмею. Гара відэльцаў, шклянак, талерак, сурвэтак. Навошта столькі? Не ведаю дагэтуль! Але экспромт спрацаваў. Атрымалася нядрэнна, — успамінае пераможца.

Пара кажа, што з-за работы і вучобы вольнага часу ў будні амаль няма. На выхадных яны ходзяць у кіно, кавярню, сустракаюцца з сябрамі. Дзяцей пакуль не плануюць: «Усяму свой час». Кірыл і Даша хочуць застацца ў сталіцы. Тут, на думку сям'і, больш магчымасцяў для прафесійнага росту. А для амбіцыйных маладых людзей на гэтым этапе жыцця такое важна.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**

*У ліку найлепшых*

# НАНКІН ЧАКАЕ НАШЫХ

## Хто там стане першым у брэйк-дансе?

**23 чэрвеня ў кітайскім Нанкіне адбудзецца чэмпіянат свету па брэйк-дансе. А ў сакавіку ў Мінску прайшоў адбор у зборную Беларусі, падчас якога за права прадстаўляць нашу краіну на ім спаборнічалі танцоры як малодшага, так і старэйшага пакалення з розных гарадоў. Уладзімір ЯНУШКЕВІЧ, вядомы ў танцавальнай тусоўцы як бібой Volodya, і Аляксандр ВІЛЬБІК — бібой Calipso, сталі найлепшымі ў намінацыі 16+ сярод хлопцаў, а прадстаўніца маладога пакалення брэйка Алена КОТ — у той жа намінацыі сярод дзяўчат. Перамożцы расказалі «Чырвонцы. Чырвонай Змене», як яны захоўваюць запал да танца на працягу многіх гадоў, чаму важна трымаць сябе ў добрай фізічнай форме і чаго чакаць ад выступоўцаў на чэмпіянаце свету па брэйку сёлета.**



Алена Кот.

***— З чаго ўсё пачалося асабіста для вас?***

**Уладзімір:** — Я стаў займацца гэтым кірункам у 2000 годзе, калі мне было 13 гадоў. Тады з іншымі хлопцамі з двара мы вучыліся тэхніцы руху па відэакасетах. Усё здавалася нязведаным і не мела вялікай папулярнасці ў нашай краіне. Цяпер жа з кожным годам з'яўляецца больш школ, трэнераў, гатовых весці за сабой, больш спаборніцтваў і фестываляў, і гэта вельмі крута.



Уладзімір Янушкевіч (другі злева).

**Аляксандр:** — Брэйк-данс увайшоў у маё жыццё, калі я яшчэ вучыўся ў школе. З тых часоў ён для мяне іграе важную ролю. Імкнуся ўдзельнічаць у разнастайных спаборніцтвах, бо невядома, які конкурс станецца пачаткам чагосьці большага. Прыемна назіраць за тым, як культура брэйка з гадамі мяняецца. Раней заняткі праходзілі на ўзроўні двара або школы, у нас не было добрай тэхнікі выканання танца. Цяпер жа хуткасць навучання дзяцей узрастае, яны схопліваюць усё імгненна.

**Алена:** — Мне 16, і я займаюся брэйк-дансам пяць гадоў. На трэніроўкі хаджу шэсць разоў у тыдзень — я ўпартая і мэтанакіраваная, выязджаю на спаборніцтвы ў розныя гарады Беларусі і ў Расію. Лічу сябе ўніверсальным танцорам: люблю трэніравацца ў зале як асобна, так і з іншымі ў камандзе. Дарэчы, батлы мяне прыцягваюць больш, чым выступленні без саперніка — у іх больш імправізацыі. Для мяне важны спаборніцкі дух, падабаецца, што ў гэтым кірунку танца няма ніякіх абмежаванняў.

***— Хлопцы, вы ўжо больш за дзесяць гадоў вучыце брэйку іншых, але і адначасова самі ўдзельнічаеце ў розных мерапрыемствах. Наколькі для вас важны спаборніцкі дух?***

**Уладзімір:** — Ён звычайна прысутнічае, але танец — справа выпадку: недаспаў або прыехаў з дрэнным настроем — прайграў. Дасведчаныя выступоўцы не ўспрымаюць такія пройгрышы блізка да сэрца: учора атрымалася горш, заўтра будзе нашмат лепш. Мне падабаецца, што брэйк дае магчымасць развіць сябе ў любым кірунку: хтосьці больш музыкальны, нехта — артыстычны. Камусьці падабаецца выступаць на фестывалях і тусоўках, а некаму спаборнічаць. Я імкнуся ахопліваць як мага больш актыўнасцяў.

**Аляксандр:** — Дарэчы, брэйк для батлаў адрозніваецца ад брэйка для выступленняў. Батл — гэта дыялог, а апошнія хутчэй патрэбныя для таго, каб падаграваць азарт унутры сябе і заводзіць публіку ў зале. Мне падабаецца браць удзел і ў тым, і ў другім.

***— Для вас важна тое, як рэагуе публіка падчас выступленняў?***

**Аляксандр:** — А я не думаю пра рэакцыю залы, паглыбляюся ў свае думкі і прытрымліваюся музыкі. Захоўваю спакой у любой сітуацыі і не паддаюся эмоцыям. Прыязджаючы на спаборніцтвы, мы не ведаем, які трэк нам паставяць падчас выступлення. Часам гэта тое, што падабаецца і прыносіць задавальненне, а часам тое, чаго ніяк не чакаеш.

**Алена:** — Як бывае ў многіх пачаткоўцаў, спачатку я баялася выступаць перад вялікай аўдыторыяй, але праз некаторы час усе сумненні развеяліся. Каб быць больш упэўненай, пасля кожнага спаборніцтва гляджу на сябе на відэа, часам памногу разоў, аналізую недахопы. Калі сумняваюся ў тэхніцы руху, раюся са старэйшымі калегамі. Думаю, уласны стыль у мяне пакуль не сфарміраваны, але я не хвалююся: усё прыходзіць з часам.

***— Як часта выязджаеце на спаборніцтвы? Як праходзіла падрыхтоўка да адбору на чэмпіянат свету?***

**Уладзімір і Аляксандр:** — Знаходзіцца ў раз'ездах для нас звычайная справа. Раз-два ў месяц едзем на спаборніцтвы, а бывае і больш — усё залежыць ад таго, ці ёсць вольны час. Да адбору ў зборную асаблівай падрыхтоўкі не было, таму што мы трэніруемся бесперапынна кожны дзень. Але тады было велізарнае жаданне выйграць. І мы рады, што ўсё атрымалася, што зможам годна прадставіць нашу краіну ў Кітаі летам.

**Алена:** — Перад адборам на чэмпіянат я трэніравалася больш узмоцнена, таму што была выразная мэта — перамагчы. Маё правіла для сцэны гучыць так: калі пачала — не сумнявайся ні ў чым. Ніколі не сачу за рэакцыяй залы, ні аб чым не думаю падчас выступлення. Проста раблю тое, што падабаецца.

***— Апошняе пытанне для дзяўчыны: у цябе ёсць яшчэ якія-небудзь захапленні акрамя танцаў?***



Аляксандр Вільбік.

— Заўсёды была спартыўнай, таму магу развівацца ў любым кірунку. Гуляю ў футбол, баскетбол, валейбол, настольны тэніс. Не загадваю на доўгія гады наперад, але стаць трэнерам — крутая перспектыва. Зараз для мяне няма розніцы, хто мой сапернік: хлопец ці дзяўчына, яму 15 гадоў або 25. Галоўнае — паказаць, на што я здольная. Удзельнічаю як у камандных батлах, так і сольна. Трымаць сябе ў добрай фізічнай форме — абавязковая ўмова для поспеху, таму часта хаджу на сілавыя трэніроўкі. Да таго ж звычайна спаборніцтвы па брэйку доўжацца цэлы дзень, з раніцы да ночы. Брэйк займае амаль увесь вольны час, але гэта таго варта. Хачу стаць запатрабаванай танцоркай і заваяваць Еўропу!

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі**
**БДУ.**

# ЯК ЗАГАРТОЎВАЮЦЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**— Што ўразіла больш за іншае ў фінале рэспубліканскага этапу?**

— Усё было на высокім узроўні, арганізатары імкнуліся стварыць для нас, удзельніц, камфортныя ўмовы для творчасці і работы. Адносіны паміж дзяўчатамі склаліся добрыя, усе адна адной дапамагалі. Акрамя таго, фіналу папярэднічала шмат цікавых мерапрыемстваў: сустрэча з ветэранамі, майстар-класы па дэфіле, па аратарскім і артыстычным мастацтве, розныя фотасесіі. Гэта было крута! Адной з самых яркіх і запамінальных падзей усяго вечара на рэспубліканскім этапе стаў эпатажны выхад. Прызнаюся шчыра, эпатажнасць ніяк не асацыюе з сабой, я, хутчэй, кансерватыўная, спакойная дзяўчына. Але для мяне гэта падалося нечым новым і цікавым. Вобраз адпавядаў ракавой красуні ў чырвоным адзенні. Памятаю, перад выхадам я яшчэ сказала дзяўчатам: «Так зараз зайздрошчу гледачам, якія ўсё гэта бачаць!»

**— Асноўнай тэмай конкурсу прамоўніцкага майстэрства была «Падзея, якая змяніла ваша жыццё». Пра што ты расказала?**

— Асноўная думка: не веру ў тое, што падзеі змяняюць жыццё. Упэўнена, што я змяняю яго сама. Лічу сябе ўпартай дзяўчынай, гэта дапамагае мне дасягаць пастаўленых мэт. Ніколі не разлічваю атрымаць што-небудзь проста так, імкнуся кіраваць усім самастойна.

**— Гучыць упэўнена. Гэта адна з тваіх рыс характару?**

— Галоўнае, я не лічу сябе самаўпэўненай, асабліва тое датычыцца конкурсаў або спаборніцтваў. Нармальна стаўлюся да пройгрышаў, аднак заўсёды аналізую свае выступленні. Ніколі не настройваюся абавязкова на перамогу, вось падчас фіналу проста хацела годна прадставіць свой універсітэт, паказаць, на што здольная і атрымаць пэўны вопыт. Прыемна, што ўсё выйшла нават лепш, чым планавалася.

**— Конкурс навучыў цябе чамусьці? Якія магчымасці адкрыў?**

— Уставаць своечасова і збірацца да сустрэч загадзя. А яшчэ ўсё рабіць хутка, акладна і па справе. Зразумела, што пасля перамогі маё жыццё стала больш актыўным, мяне запрашаюць на розныя мерапрыемствы і акцыі. Але варта сказаць, што іншым дзяўчатам-удзельніцам таксама аддаецца вялікая ўвага, таму, паўтаруся, не трэба зацыклівацца толькі на першых месцах.

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота прадстаўлена гераіняй публікацыі.**



### У працяг тэмы

Днямі ў Стаўрапольскім палацы культуры і спорту ў рамках афіцыйнай праграмы III Міжнароднага фестывалю Студэнцкая вясна краін БРІКС і ШАС прайшоў XXVIII Міжнародны конкурс прыгажосці і таленту «Каралева студэнцтва — 2019».

У гэтым шоу прымалі ўдзел 16 таленавітых дзяўчат-студэнтак з Расіі, Беларусі, Арменіі, Літвы, Індыі, Камарскіх астравоў, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана, Узбекістана, Шры-Ланкі і Туркменістана.

Нашу краіну на прэстыжным студэнцкім конкурсе прадстаўлялі тры беларускія грацыі: студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Таццяна Шчэрбач, пераможца рэспубліканскага конкурсу «Каралева Вясна Беларусі — 2019», студэнтка Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Лізавета Абрамкіна, «Першая віцэ-каралева Вясна Беларусі — 2019», а таксама студэнтка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка Яўгенія Кудлач, «Каралева Вясна Беларусі анлайн».

Удзельніцам трэба было прайсці некалькі конкурсных этапаў: дэфіле, спартыўны, інтэлектуальны і творчы. У выніку Таццяна Шчэрбач заваявала тытул «Віцэ-каралева студэнцтва»!

*Улюбёныя ў прыроду*

# ВАМ СМС АД... ВОЎКА!



Фота Аляксандра ПЕКАЧА.

**«Канец страшнай ваўчыцы», «Пад Слонімам застрэлілі вялізнага воўка. Магчыма, таго самага чупакабру-забойцу», «Вёска ўзвыла воўкам: у Гарадоцкім раёне шэрыя драпежнікі прывучылі вяскоўцаў да вілаў і сякер...» Вакол гэтага звера існуе шмат страхаў, стэрэатыпаў, якія стараюцца разбурыць у грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» дзякуючы праекту vouk.by.**



Фота Таццяны КАПІТОНАВАЙ.

**Яе супрацоўніца Ірына КАШПЕЙ любіць жывёлу ўсёй душой. Паслухаем яе?**

**Суразмоўніца вывучае ваўкоў у Белавежскай пушчы і на Палессі. Як? Пры дапамозе спецыяльных GPS-ашыйнікаў, якія ўключаюцца раз у гадзіну і фіксуюць месцазнаходжанне звера. Дзяўчына ездзіць у экспедыцыі на адлоў, каб павесіць тыя самыя ашыйнікі, збірае генетычны матэрыял, працуе з фотапасткамі, аналізуе замежную літаратуру і рыхтуе навуковыя публікацыі, якія адаптуюць і публікуюць у спецыяльным «воўчым» блогу. Там можна даведацца, чаму жывёлы выюць, што ўваходзіць у іх ланч-бокс, і як шэрыя праводзяць свае ўік-энды. Зверу можна выбраць імя, а таксама прасачыць за яго перамяшчэннямі. Ваўкі Мікола, Міхась, Руды, Завея, Алесь і Луна прываблiваюць вялікую аўдыторыю сваімі гісторыямі і становяцца сапраўднымі сябрамі многіх беларусаў...**

...З самага дзяцінства маленькая Іра ведала: кожны звер важны і карысны, і кожнаму ёсць месца ў жыцці. Аднак, калі глядзела фільмы пра дзікую прыроду, ніколі не думала, што стане яе абаронцай.

— Я нарадзілася на Палессі, але пасля з сям'ёй пераехала ў Мінск, і тут ужо скончыла школу, — расказвае сваю гісторыю суразмоўніца. — Думала, што калі пайду на біялагічную спецыяльнасць, то стану толькі настаўнікам. Насамрэч, аказалася, што ў гэтай прафесіі ёсць вялізная колькасць розных кірункаў. Спачатку вырашыла, што максімальна блізка маім інтарэсам адпавядае медыцына. І паступіла на ўрача. Але потым зразумела, што гэта не маё. Размеркавалася ў навукова-практычны цэнтр, дзе працавала ўжо на шостым курсе. Але і там не атрымлівала ні радасці, ні задавальнення. Уставала ранкам і думала: «Хутчэй бы вечар, выхадныя...» Не таму, што работа дрэнная, не. Проста гэта не тое, чым хацелася б займацца, дзе я змагла б рэалізаваць сябе. Таму пасля размеркавання сышла. Прычым, у нікуды. Падумала: «Як будзе, так і будзе».

**— Калі ваша жыццё кардынальна змянілася?**

— Мабыць, пачалося ўсё з падачы заяўкі па праграме Еўрапейскай валанцёрскай службы ў найбуйнейшую італьянскую арганізацыю па абароне навакольнага асяроддзя. Падала і, як гэта часта бывае, зусім забылася пра яе. На месца прэтэндавала вельмі шмат ахвотных, і я нават не ўяўляла, што шанц выпадзе менавіта мне. Аднак, акурат пасля таго, як звольнілася і паехала на адпачынак, мне прыйшло запрашэнне на сумоўе. Усё само склалася так, як нават і не планавала. Я трапіла ў праект па абароне навакольнага асяроддзя і дзікай прыроды і на ўвесь 2017 год з'ехала ў Італію. Вось менавіта тады быў такі пераломны момант, калі я зразумела: мары спраўджваюцца, і ўсё, што было нерэальнае і недасягальнае, становіцца рэчаіснасцю. Дзякуючы праекту ў Італіі я па-іншаму паглядзела на тое, чым займаюся, пачала прыслухоўвацца да сябе і сваіх жаданняў...

**— ...І менавіта яны прывялі вас у арганізацыю «Ахова птушак Бацькаўшчыны»?**

— Можна і так сказаць. Пасля праекта я завочна паступіла ў магістратуру Эдынбургскага ўніверсітэта на спецыяльнасць «Біяразнастайнасць, дзікая прырода і здароўе экасістэм». А дзе ж працаваць? Мне вельмі хацелася атрымаць досвед у гэтай сферы. Даведалася пра АПБ, прыйшла туды і сказала: «Можна, калі ласка, да вас?» Мне не патрэбны былі грошы, не шкада было і часу. Прыходзіла ў офіс і рабіла ўсё з радасцю. Недзе праз паўтара месяца мне ўсё ж прапанавалі пасаду. Цяпер я займаюся ваўкамі і іншымі відамі, напрыклад, барсуком.

**— Як думаеце, Палессе неяк паўплывала на выбар вашага занятку?**

— Раней нават не задумвалася, але цяпер мяркую, што вельмі. Гэта асаблівы рэгіён Беларусі, да якога ў мяне прывязанасць, любоў. Увогуле, як многія дзеці, на летнія канікулы я ездзіла да бабулі ў вёску. І яна мне часта казала, што хадзіла па лесе задраўшы галаву: назірала за птушкамі, пчоламі, што апылялі расліны, замест таго, каб збіраць грыбы ці ягады...



Здымак, зроблены фотапасткай.

**— Вы ездзіце на адлоў ваўкоў... Як гэта адбываецца?**

— Спачатку на выбранай мясцовасці ўстанаўліваюцца пасткі, якія не дазваляюць зверу выцягнуць лапу, але не пашкоджваюць яе. Каб жывёла доўга не знаходзілася ў пастцы, уся наша каманда разбіваецца на групы і часта правярае іх. Далей, калі воўка злавілі, спецыяліст робіць яму ўкол, каб той заснуў. Тады надзяваем GPS-ашыйнік, збіраем генетычны матэрыял, фатаграфуем, узважваем, вымяраем рост — робім усё, што неабходна да далейшага вывучэння. Пасля ўводзяць антыдот, і воўк збягае. А мы сочым за перамяшчэннямі. Раз у гадзіну з сім-карты нам дасылаецца паведамленне пра месца яго знаходжання. Так, ваўкі шлюць нам СМС-кі *(усміхаецца)*. Ашыйнікі працуюць некалькі месяцаў, а калі заканчваецца зарад батарэі, самі адкрываюцца і падаюць.



Фота Аляксандра ПЕКАЧА.

**— А як вы потым дазнаецеся пра жыццё звера? Ён жа сам не расказвае...**

— Атрымліваючы звесткі з ашыйніка, мы можам сачыць за маршрутам воўка. Па каардынатах становіцца зразумела: ён у зграі, калі тэрыторыя пастаянная, ці адзіночка, калі хаатычная. Таксама мы пачынаем хадзіць па слядах звера і тым чынам можам прасачыць, чым ён харчуецца — па рэштках жывёл. Зноў жа, у зграі могуць здабыць буйную жывёлу, адзін жа харчуецца дробнымі ці падлай. Яшчэ збіраем даныя з фотапастак, каб вызначыць колькасць звяроў ці ідэнтыфікаваць канкрэтнага, калі ён наш. Была такая гісторыя, калі мы некалькі дзён атрымлівалі даныя з адной кропкі. Што здарылася? Думалі, мо, ашыйнік ужо ўпаў... Аказалася, што звер проста ляжаў пад елачкай, чакаў, калі скончыцца дождж.

**— Што вы адчулі, калі ўпершыню ўбачылі воўка?**

— О! Неверагодную радасць! Не магла стрымаць эмоцый! Вось, там сапраўдны воўк, і ён на нас глядзіць! Падыходзіць бліжэй было нельга, пакуль спецыяліст не ўколе транквілізатар. Ведаеце, убачыць воўка на Палессі — вялікая ўдача. Бо, як аказалася, там іх не так многа, значна меней, чым у Белавежскай пушчы. Адразу вельмі захацелася яго памацаць, даведацца, як ён пахне, якая ў яго поўсць. Як высветлілася, жорсткая. Але вушы мяккія *(усміхаецца)*. Увогуле, гладзіць воўка — нейкае дзівоснае дзеянне. Гэта тое, з чым ты не сутыкнешся ў звычайным жыцці. Але, дзякуючы цудоўнай рабоце, у мяне ёсць такая магчымасць.

**— Ці можа звычайны чалавек сустрэцца з гэтым зверам у прыродзе?**

— Многія думаюць, што калі пойдзеш у лес, абавязкова сустрэнеш яго, і трэба будзе абараняцца. Гэта зусім не так. Па-першае, ён, хутчэй за ўсё, даведаецца пра ваша набліжэнне першы і пастараецца схавацца. Нармальная, не шалёная жывёла, ніколі не выйдзе да чалавека. Толькі ў выпадку, калі ён малады адзіночка, і яму проста цікава, ці ім кіруе голад. Або бываюць сітуацыі, калі чалавек падыходзіць да звера з падветранага боку, і той не чуе. Але такое адбываецца вельмі рэдка, і часцей з тымі, хто непасрэдна працуе ў лесе. Таму, кажучы: «Убачыў воўка — радуйся». Гэта сапраўды вялікая ўдача.

**— Але ўсё ж такі, раптам такое адбудзецца...**

— Пра гэта добра распавядаў грузінскі вучоны Ясон Барыдзэ, які вялікую частку жыцця прысвяціў вывучэнню воўка. Ён раіць не бегчы, а ціхенька адступаць, схавацца за чымсьці, што будзе па-за межамі яго поля зроку. Трэба паказваць сваё абсалютнае нежаданне з ім знаёміцца, не лезці да яго. Усё ж такі дзікі звер... Унікальнага рэцэпту тут няма. Ваўкі ж, як і людзі, усе розныя.

**— А да палявання вы як ставіцеся?**

— Адмоўна, але я разумею, што людзі на цяперашні момант без гэтага не могуць. Аднак калі і трэба адстрэльваць, то, напрыклад, так званых пераяркаў, тых маладых, што адлучыліся ад зграі, якія могуць заходзіць у вёскі і шкодзіць людзям. Тады праблема звужаецца. За тэрыторыяй сочыць мацёрая пара, якая перадае ў спадчыну сваю культуру палявання, і яна ніколі не дазволіць прыйсці на «свой участак» іншым ваўкам, а таксама падтрымлівае неабходны прыродны баланс там, дзе жыве. Але, на жаль, у нас лічыцца прэстыжным забіць менавіта мацёрага воўка. Пасля чаго зграя распадаецца, а моладзь не ўмее паляваць. Яны разыходзяцца па яшчэ большай тэрыторыі, часцей выходзяць да людзей, больш размнажаюцца. Вядомы факт: калі пачынаюць забіваць ваўкоў, іх колькасць павялічваецца. Але, калі знішчаць іх шмат, як гэта робіцца зараз, папуляцыя становіцца генетычна збедненай, няма прытокаў новых генаў. Яны перастаюць выконваць тую функцыю, якую павінны.

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**

## А вы ведалі?

**Па звестках Міністэрства лясной гаспадаркі за 2018 год, колькасць ваўкоў на тэрыторыі Беларусі складала 1348 асобін (здабыта было 1873).**

**З 2000 года аб'ёмы вымання з прыроды жывёлы гэтага віду штогод складаюць не менш за 50 працэнтаў ад улічанай колькасці. Пры гэтым за апошнія тры гады здабыча стала практычна такой жа, як і выяўленая папуляцыя. Падаецца, што пры такім інтэнсіўным паляванні колькасць звера павінна была пачаць зніжацца. Але яна застаецца стабільнай і нават працягвае расці.**

**Справа ў тым, што рост колькасці жывёлы можа стымулявацца якраз актыўнай здабычай. Воўк з'яўляецца тэрытарыяльным драпежнікам, і пры гібелі пары іх паляўнічыя ўгоддзі вызваляюцца, што выклікае натуральныя міграцыйныя перамяшчэнні. Апроч таго пры паляванні адбываецца так званая кампенсацыйная нараджальнасць.**

**Варта таксама адзначыць, што ваўкі ва ўмовах зніжэння колькасці іх асноўнай ахвяры — дзікіх капытных — не зніжаюць сваёй уласнай. Гэта сведчыць аб высокай пластычнасці віду. Драпежнік мае дастаткова багаты набор кармоў і можа хутка пераключацца з аднаго на іншыя.**

**Спецыялісты адзначаюць важную ролю звера ў рэгуляванні папуляцый лісіц і янотападобных сабак, якія распаўсюджваюць шаленства і аказваюць негатыўнае ўздзеянне на рэсурсныя віды паляўнічай фауны. Акрамя таго, воўк здольны падтрымліваць на пэўным узроўні колькасць бабра, што змяншае шкоду лясной і сельскай гаспадаркам.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | |
| **Продавец** | ООО «Кеанед», 220037, г. Минск, переулок 1-й Менделеева, 50-3, кабинет 13 | |
| **Предмет аукциона** – объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, по адресу: г. Минск, пер. Менделеева 1-й 50 (2,3) | | |
| № лот | Наименование (назначение) | Начальная цена с НДС 20 % |
| 1 | **Помещение общественного питания** общей площадью 635,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-708163897<br>**Складское помещение общей площадью** 111,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-708163898 | **365 687,00 долларов США*** |
| **Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, по адресу:** Могилевская обл., г. Могилев, ул. Вишневецкого, 8а (3,4) | | |
| 2 | **Нежилое изолированное помещение** (помещение, не относящееся к жилищному фонду) общей площадью 36,9 кв. м, инвентарный номер 700/D-101889<br>**Нежилое изолированное помещение** (помещение, не относящееся к жилищному фонду) общей площадью 884,8 кв. м, инвентарный номер 700/D-101888 | **304 161,0 долларов США** |
| **Продавец** | ООО «Сплендор», Минская обл., Воложинский р-н, г. п. Ивенец, ул. Промышленная, 30, к. 1 | |
| **Предмет аукциона** – изолированное помещение по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/14-2 | | |
| 3 | **Административное помещение** общей площадью 506,5 кв. м, инвентарный номер 200/D-149801 | **101 300 долларов США** |
| **Продавец** | ООО «Кеакан», 220125, г. Минск, пр-т Независимости, 185, пом. 7 | |
| **Предмет аукциона** – изолированное помещение по адресу: г. Минск, ул. Краснозвездная, д. 9, пом.1Н | | |
| 4 | **Помещение неустановленного назначения** общей площадью 227,4 кв. м, инвентарный номер 500/D-690215 | **90 000 долларов США** |

*расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок заключения договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **15.07.2019** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **11.07.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА РУП «БЕЛОРУСНЕФТЬ-БРЕСТОБЛНЕФТЕПРОДУКТ»**

| Предмет торгов | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| ЛОТ № 14: грузовой бортовой ГАЗ-33023, регистрационный знак АО0409, г. в. 2001 г., кузов № 330230Y0008330 33023010000001 | **218,74** | **21,87** |
| ЛОТ № 19: полуприцеп цистерна ППЦ 22, регистрационный знак А 3887 А-1, г. в. 2007 г., кузов № Y3M99190070000785 | **1 274,17** | **127,42** |
| ЛОТ № 20: полуприцеп специальный цистерна ППЦ 22, регистрационный знак А 3207 А-1, г. в. 2007 г., кузов № Y3M99190070000811 | **1 042,17** | **104,22** |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Организатор аукциона** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10 , BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится <u>26 июня 2019 г. в 11. 00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325</u>**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, можно узнать у организатора аукциона по телефонам 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 25 июня 2019 г. до 17.00**

*** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона**

*** Ранее извещение о продаже имущества РУП «Белоруснефть-Брестоблнефтепродукт» опубликовано в газете «Звязда» от 16.05.2019 г.**

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 25 июня 2019 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 20 % после первых несостоявшихся торгов по продаже объекта недвижимости, принадлежащего Унитарному производственному предприятию «Гомель ВТИ» на праве хозяйственного ведения**

| № лота | Наименование объекта, его местонахождение | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Встроенное нежилое изолированное помещение,** инв. № 330/D-11304. Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Якуба Коласа, д. 21 | Назначение: нежилое помещение. Расположено на первом этаже в пятиэтажном блочно-силикатном многоквартирном жилом доме, 1968 года постройки. Общая площадь 178,7 кв. м. Часть помещения – 24,0 кв. м, сдана в аренду сроком по 31.12.2019 г. | **102 720,00** | **5 136,00** |

**Земельный участок** для обслуживания здания, в котором расположено изолированное помещение, на праве постоянного пользования площадью **0,1434 га (доля 3/100)** с кадастровым номером 341500000002000031. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 24 июня 2019 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **25 июня 2019 г**.
Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
**При подаче заявления участник должен иметь:** 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке – доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 13 июня 2019 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 3 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 15 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта.
Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 09.04.2019 г. № 66

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23.**
**Тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95 • сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by**
**Продавец: унитарное предприятие «Гомель ВТИ», г. Гомель, ул. Барыкина, 299. Тел.: 8 (0232) 42-33-82, 8 (029) 365-58-30**

**ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении первых повторных торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ПЛК-строй» (УНП 191125547, г. Минск, ул. Лобанка, д. 79, пом. 33), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов***: **28 июня 2019 года**. Начало в 10.00, окончание в 12.00. Заявки принимаются с 13 июня 2019 года по 27 июня 2019 года.
***Место проведения торгов:*** Минск, пр-т Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:* ООО «ПЛК-строй» (УНП 191125547)** в лице управляющего общества с ограниченной ответственностью «Деловой консалтинговый центр».

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, руб | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Незавершенное законсервированное капитальное строение административно-бытовой корпус (четырехэтажное здание с подвальным этажом), инв. № 600/U-153002, расположенное по адресу: Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 77, район д. Богатырево, общая площадь 1815,1 кв. м, готовность – 47 %.<br>Сведение о земельном участке: кадастровый номер участка – 623680000001000344; площадь участка – 1,0477 га (7/20 доли в праве аренды) | 297 900,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |
| 2 | Незавершенное капитальное строение склад № 2 (одноэтажное здание), инв. № 600/U-153003, расположенное по адресу: Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 77/2, район д. Богатырево, общая площадь 515,4 кв. м, готовность – 60 %.<br>Сведение о земельном участке: кадастровый номер участка – 623680000001000344; площадь участка – 1,0477 га (7/20 доли в праве аренды) | 133 200,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |

**Для участия в торгах необходимо:**
в срок до 17.00 **27 июня 2019 года** (за день до окончания приема заявлений) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY56MTBK30120001093300086460, в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».
Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 27.06.2019 (за день до торгов) заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 N 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.
Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.
Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.
Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:
– заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
– на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.
В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение в размере 5 % от цены продажи предмета торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.
Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.
Сведения о предыдущих торгах:
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты – 48 (28915) за 14.03.2019

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе по продаже имущества, изъятого, арестованного и (или) обращенного в доход государства**

**Лот № 1.** Одноэтажное кирпичное здание Городиловского сельского клуба, инв. № 630/С-59308. Площадь – 419,4 кв. м. Адрес: Минская обл. Молодечненский р-н, Городиловский с/с, д. Городилово. Земельный участок 623880803601000066, площадь – 0,1100 га. Право аренды по 08.08.2021. **Начальная цена продажи – 3 672,00 бел. руб. Задаток – 360,00 бел. руб.**
**Лот № 2**. Земельный участок, кадастровый номер – 621381712601000019 площадью 0,2500 га. Целевое назначение: для строительства и обслуживания жилого дома. Адрес: Минская обл., Вилейский р-н, Долгиновский с/с, д. Микулино. **Начальная цена продажи – 1 062,00 бел. руб. Задаток – 100,00 бел. руб.**
Подробная информация о лотах находится на сайте Организатора аукциона ino.by

**Условия:** 1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 02.07.2019 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %.**
Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе **02.07.2019** (Лот №__).
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений – **28.06.2019** в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 324 70 57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356 90 03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении внеочередного общего собрания акционеров**

Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белэнергозащита» состоится 25 июня 2019 года в 11.00 по месту нахождения общества: г. Минск, пер. Бехтерева, 7, актовый зал ОАО «Белэнергозащита».
Собрание проводится в очной форме. Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется в день проведения собрания по месту (адресу) проведения собрания. Время начала регистрации: 10.00. Время окончания регистрации: 10.45.
Дата формирования реестра владельцев акций общества, на основании которого будет составлен список лиц, имеющих право на участие в собрании: 14 июня 2019 года.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ
О вхождении ОАО «Белэнергозащита» в состав холдинга «Белэнергострой холдинг».
Ознакомление лиц, имеющих право на участие в собрании, с информацией (документами), подлежащими предоставлению при подготовке к проведению собрания, будет осуществляться в рабочие дни и рабочее время с 17 июня 2019 года по 24 июня 2019 года по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, 7, а в день проведения собрания – во время и в месте проведения собрания.
Для регистрации участнику собрания необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность, а также, если необходимо, документы, подтверждающие его полномочия: доверенность и/или другие документы в соответствии с действующим законодательством. УНП 100098854




# ЛЁС БЫЦЬ БІЯТЛАНІСТАМ

**...Ён хуткі, як страла. Ляціць, разразаючы паветра. Вакол мільгаюць дрэвы і кусты. У вушах шуміць: «Давай-давай! Працаваць! Оп, оп, оп!» Напэўна, усе здагадаліся, хто гэта. Біятлон — не работа, лёс. Лёс 22-гадовага капітана нацыянальнай зборнай Антона СМОЛЬСКАГА.**

**Усім вядома, што Беларусь — спартыўная краіна. Сярод зімовых відаў за першае месца па папулярнасці спаборнічаюць хакей і біятлон. І апошні ўсё часцей перамагае... Дар'я Домрачава і Надзея Скардзіна, Сяргей Новікаў і Алег Рыжанкоў — гэтыя людзі стваралі гісторыю беларускага, ды і сусветнага, біятлона. Змяняюцца эпохі, і надыходзіць час маладых і таленавітых. Менавіта такім і з'яўляецца мой суразмоўнік.**

**Як дзеці трапляюць у біятлон? Як выбіраюць сваё, што сэрцу мілейшае? Якія выпрабаванні і складанасці чакаюць іх на доўгім спартыўным шляху? Аб чым біятланісты мараць, дзе знаходзяць матывацыю, як змагаюцца з няўдачамі? Паспрабуем даведацца.**



***— Добры дзень, Антон. Як у тваім жыцці з'явіўся спорт увогуле і ўласна біятлон? Чым ён так цябе прываблівае?***

— У шостым класе — у 12 гадоў — большасць маіх аднакласнікаў і сяброў займаліся ў лыжнай секцыі. Я доўга назіраў за імі, у мяне была зацікаўленасць. І вось у адзін цудоўны дзень я таксама трапіў туды. Так біятлон стаў маім жыццём, у якім я існую 24 на 7. А зацікавіў ён мяне, напэўна, сваёй непрадказальнасцю.

***— Спорт, як вядома, гэта жорсткая дысцыпліна. Выпрабаванне на трываласць, асабліва для маладога чалавека. Ці складана казаць «не» сваім жаданням?***

— Канешне, не проста. Але з цягам часу дысцыпліна набывае статус звычкі. Мне ўжо складана не прытрымлівацца рэжыму харчавання і рэжыму дня.

***— Вы вымушаны заўсёды быць далёка ад дома, сяброў, любімых, а яшчэ і тая самая дысцыпліна... Не ўзнікала жадання кінуць усё дзеля «нармальнага» жыцця?***

— Не, прынамсі ў мяне. Канешне, сумуем па родных і блізкіх, але для прафесіянальнага спартсмена апошняе ўжо вельмі складана.

***— І ўсё ж такі, калі ты вырашыў, што далей без біятлону ніяк?***

— У 2014 годзе, калі трапіў у юніёрскую каманду ў Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы», вырашыў, што спорт будзе неад'емнай часткай майго жыцця.

***— Ты займаешся ўжо дзесяць гадоў. Адчувальны багаж вопыту. Напэўна, было рознае? Жыццё ж, як вядома, гэта падзенні і ўзлёты. Як, перажыўшы паражэнне, не страціць імкнення да перамогі?***

— У кожнага чалавека свой характар. Мяне, напрыклад, матывуюць няўдачы. І не мае значэння, што гэта: перагдача ва ўніверсітэце або выступленне, якім я незадаволены. Каб не страціць імкнення да перамогі, я лічу, трэба спрабаваць тысячу разоў і, нарэшце, адзін з іх стане пераможным.

***— Якімі якасцямі, на твой погляд, павінен валодаць біятланіст для дасягнення поспеху?***

— У сучасным спорце зараз перамагаюць веды. Як гэта ні дзіўна, прыродныя фізічныя даныя маюць не самае вялікае значэнне. Чалавек павінен быць інтэлектуалам, сціплым, працалюбівым і мэтанакіраваным. І толькі тады ён зможа стаць лепшым з лепшых.

***— Я на ўсё жыццё абраў дарогу,***

***На якой калючак больш, чым руж...***

***Мне здаецца, што гэтыя словы Аркадзя Куляшова ідэальна падыходзяць да цябе. Яшчэ ў дзяцінстве ты намеціў арыенціры і цяпер смела крочыш наперад. Раскажы, якія мэты, лакальныя і глабальныя, ставіш перад сабой?***

— Не сакрэт, што марай кожнага спартсмена з'яўляецца алімпійскі медаль. І я не выключэнне. Стараюся атрымаць максімум ад усяго, што маю.

***— А пра што яшчэ марыць біятланіст?***

— Пра «чыстую» стральбу і хуткую хаду!

***— Сёлета наша краіна стала пляцоўкай для правядзення шматлікіх спартыўных мерапрыемстваў сусветнага ўзроўню. Гэта чэмпіянаты Еўропы па біятлоне і фігурным катанні, Кубак свету па фрыстайле. Шмат мерапрыемстваў напярэдзе: Еўрапейскія гульні, чэмпіянат свету па летнім біятлоне...***

— Без сумневу, такія спаборніцтвы прыцягваюць увагу. Людзям падабаецца спорт, а яны стануць яго рэкламай. Хацелася б, каб хлапчукі і дзяўчаты прыходзілі і запісваліся ў спартыўныя секцыі.

***— А як знайсці сваё і не памыліцца? Што ты сказаў бы маладым людзям, якія яшчэ не вызначыліся са сваім жыццёвым шляхам?***

— Гэта вельмі складаны выбар. Цяпер існуюць шматлікія тэсты на схільнасць да таго ці іншага спартыўнага кірунку. А парада ў мяне такая: не баяцца ісці наперад, прымаць самастойныя рашэнні. Паверце ў сябе, і ўсё ў вас атрымаецца.

***— Дзякуй, Антон, за цікавую гутарку. Спадзяюся, што твае словы натхняць чытачоў на новыя здзяйсненні.***

Паразмаўляўшы з біятланістам, можна зрабіць самую галоўную выснову: не бойцеся штосьці мяняць у сваім жыцці, смела запісвайцеся ў секцыі і гурткі. Але памятайце, што спорт — гэта не толькі прыгожае жыццё з падарожжамі, перамогамі і славай. У першую чаргу, ён — самаахвярнасць, адданасць і ўпартая праца. Калі ёсць гэтыя тры кампаненты, будуць і тры п'едэсталы... 

Яму 22. І ён хутчэйшы за стралу. У прыярытэце ў яго — розум, талент і настойлівасць. За плячыма чэмпіянаты свету і Еўропы. Яму скарыліся нават Алімпійскія гульні, на якіх ён выступаў. У чым сакрэт поспеху Антона Смольскага? У імкненні да перамогі ён робіць тысячу спроб. І я ўпэўненая, што тысяча першая, пераможная для яго, наступіць зусім хутка.

**Алёна КУХАРАВА,**
**выпускніца 11 класа**
**Васькавіцкай СШ**
**Слаўгарадскага раёна.**
**Фота прадстаўлена героем матэрыялу.**

## Пра аўтара

**— Мне 17 гадоў, і я патрыётка. Жыццёвая пазіцыя: адданая роднаму слову і роднай краіне. З чацвёртага класа бяру ўдзел у алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры, нават дасягнула пэўных поспехаў, — расказвае пра сябе аўтарка. — Я сябе лічу актыўным спартыўным аматарам. Сярод маіх любімых відаў — біятлон, фрыстайл і фігурнае катанне. Хварэю, зразумела, заўсёды толькі за спартсменаў-беларусаў. Яшчэ вельмі люблю падарожнічаць, мару аб'ехаць усю Еўропу. Наведаць краіны, у якіх яшчэ не была, мне ўжо тры гады дапамагае посткросінг. Яшчэ я захапляюся гісторыяй роднай краіны, мару паўдзельнічаць у археалагічнай экспедыцыі. Смела магу назваць сябе чалавекам актыўным і няўрымслівым.**

**Застаецца толькі дадаць, што Алёна збіраецца паступаць на факультэт журналістыкі.**



# САКРЭТЫ АНТЫСТРЭСУ

**НАРЭШЦЕ нядзеля. Можна адпачыць ад рэпетытараў і спакойна пасядзець у інтэрнэце. Гартаю стужку — і раптам бачу прыгожае белае кацяня. Пад здымкам чытаю: «Шукаю дом для гэтага мілага стварэння». Я хутка набіраю нумар сваёй сяброўкі, якая даўно марыла пра такога.**

І вось мы ўжо на месцы. Стукаем, адчыняюцца дзверы... І нас сустракае вялікі чорны сабака. Побач на пуфіку, скруціўшыся абаранкам, дрэмле пухнатая котка. І толькі потым мы заўважаем гаспадыню.

Лера аказалася вельмі прыемнай і ветлівай дзяўчынай. Яна расказала, што проста не змагла прайсці міма бяздомнага кацяняці. Абагрэла, накарміла, вылечыла і вырашыла знайсці яму гаспадароў. Дарэчы, яе хатнія гадаванцы патрапілі ў дом гэтак жа. Аднойчы зімой дзяўчына заўважыла на лавачцы чорненькага шчанюка з самотнымі вачыма. Ён быў зусім маленькі і дрыжаў ад холаду. Котачка таксама ішла па пятах на вуліцы і жаласна мяўкала.

— Цяпер Сіма і Рэкс — неад'емная частка нашай сям'і. Мы нават ёлку прыбіралі разам! Не ўяўляю жыцця без іх. Яны мой асабісты антыстрэс. Колькі сябе памятаю, наша жыллё заўсёды было поўнае жывёл. Тры каты, два сабакі, хамячок — у нашай кватэры ўсім хапала месца, — успамінае Валерыя Пратасеня.

Жывёлы ладзяць паміж сабой. Разам спяць, гуляюць, ласуюцца пачастункамі, часам сваволяць. Лера настолькі захоплена сваімі ўлюбёнцамі, што нават стварыла асабістую Інстаграм-старонку для коткі. А чаму б і не? Гэта вельмі крэатыўна і міла. Цяпер кожны раз перад сном дзяўчына праглядае акаўнт і назірае за тым, як змяняецца і прыгажэе Сіма.

— Калі б кожная сям'я ўзяла па адным кацяняці або шчанюку, — разважае школьніца, — то ў нас на вуліцах стала б значна менш бадзяжных жывёл.

Падчас гутаркі я звярнула ўвагу на вялікую колькасць медалёў, што віселі на сцяне. Як высветлілася, гэта вынік дзесяцігадовых заняткаў спартыўнай гімнастыкай суразмоўцы.

— Спорт загартаваў мой характар, навучыў не здавацца і верыць у свае сілы. Калі нешта не ўдавалася адразу, атрымлівалася з дзясятай, дваццатай спробы. Усім рэкамендую сябраваць з фізкультурай, бо гэта здароўе і добры імунітэт, — раіць дзяўчына.

Мой погляд спыніўся і на фартэпіяна ў куце. Няўжо мая новая знаёмая захапляецца яшчэ і музыкай? Аказалася, бабуля Валерыі скончыла музычнае вучылішча і перадала ўнучцы любоў да музыкі. Дзяўчына займалася ў музычнай школе, любіць спяваць і ў складзе хору «Жураўчка» пабывала ў многіх краінах на конкурсах і фестывалях.

Прыемна сустракаць на сваім шляху таленавітых людзей з добрым сэрцам. Цяпер мы з Лерай найлепшыя сяброўкі.

**Кацярына КВАЧОНАК,**
**выпускніца 10 класа СШ № 11 г. Маладзечна.**
**Фота аўтара.**

## Пра аўтара

**— Практыка публікацый у газетах вельмі важная і карысная для мяне, бо налета я планую паступаць у БДУ на факультэт журналістыкі, — расказвае 16-гадовая аўтарка. — Калі казаць пра сябе, то я вельмі люблю падарожнічаць, мне падабаецца наведваць розныя краіны, пазнаваць іх культуру. Да таго ж мяне зусім не палохаюць палёты ў самалётах, таму пасля заканчэння ВНУ я хацела б працаваць сцюардэсай. Пакуль гэта толькі мара, але ў чалавека заўсёды павінна быць запаветнае жаданне.**

**Матэрыял Кацярыны прыйшоў на наш конкурс першым. Віншуем яе з адмысловым дэбютам і жадаем дзяўчыне знайсці кампраміс паміж сваімі марамі і памкненнямі.**

***Заканчэнне. Пачатак конкурсу ў «ЧЗ» ад 23 мая.***

SEX=БАЛЯСЫ

# КОДЫ ДОСТУПУ

**Нядаўна найбуйнейшую нарвежскую авіякампанію абвінавацілі ў сексізме. Усё з-за дрэс-коду: сцюардэс на рабочым месцы абавязалі насіць выключна высокія абцасы. Сурова, праўда? («Я спытала ў сцюардэсы, ці можа яна мяне перасадзіць ад дзіцяці, якое ўвесь час раве, крычыць і ўсё раскідвае. Яна адказала, што не. Аказваецца, гэта забаронена, калі тое дзіця — тваё».) Яшчэ адзін пункт з 22 старонак новай інструкцыі, якая рэгламентуе знешні выгляд работнікаў, — жанчыны павінны фарбаваць вочы і карыстацца танальным крэмамі. Мужчынам, наадварот, забаронены макіяж, хіба толькі калі прышч замазаць трэба. («— Прыкінь! Пасля ўсіх гэтых рэкамендацый па дрэс-кодах апранаю я, значыцца, строгую сукенку ніжэй калена, раблю някідкі макіяж, мінімум аксесуараў, закрытыя туфлі-лодачкі. Дык кадравічка і дзвюх хвілін са мной не размаўляла — выгнала! — Вась, можа ты не пагаліўся?») І што тут такога, спытаеце вы?**

Па-першае, многія авіякампаніі ўжо адыходзяць ад строгіх правілаў у адносінах да адзення персаналу, некаторыя нават адмовіліся ад абавязковых спадніц ва ўніформе сцюардэс. Што датычыцца фірмовага стылю апошніх, як па мне, дык гэта неад'емная частка іміджу любой авіякампаніі. А што, дзяўчаты ідуць у прафесію не за гэтым у тым ліку? («Сцюардэсам вельмі лёгка, бо ў салоне ўсе мужыкі ўжо адсартаваныя па класах».) А, па-другое, летась у Глабальнай справаздачы па прагрэсе ў дасягненні гендарнай роўнасці Нарвегія заняла другое месца пасля Ісландыі. І тут такі канфуз: аказваецца, на вышыні агульныя правілы не дзейнічаюць. («— Мама, тата, у мяне новая работа! Я цяпер сакратарка! — Ты не сакратарка, ты — ганьба сям'і, сынок».)

Як не дзейнічаюць яны і для тых, хто іх сам для сябе ўстанаўлівае. Вось, скажам, Кім Кардаш'ян, вядомая майстрыха прыцягваць да сябе ўвагу, дакладней, да сваёй карміцелькі — «пятай кропкі». Напачатку мадэль прагулялася па вуліцах у празрыстых легінсах ад французскага дызайнера Жана-Поля Гацье, якія так шчыльна абцягвалі тую самую кропку, што гэта, вядома ж, выклікала фурор. Балазе, на Кім пад легінсамі хоць бы былі белая бялізна, якая некалькі ратавала становішча. («На карпаратыве ў паліклініцы стрыптызёрша распранулася толькі па пояс».) А наступным разам мадэль прагулялася па Парыжу ў адных толькі чорных аксамітных трусах. Не, быў яшчэ празрысты камбінезон з леапардавым прынтам і французскі берэт, але ўсе зноў заўважылі толькі сподняе. («Для таго каб схаваць твар ад мужчын, жанчынам зусім неабавязкова надзяваць паранджу. Міні-спадніца куды больш эфектыўная!»)



Праўда, такая аддаласць абранаму стылю можа дарагога каштаваць, нават жыцця. Памятаеце, «альпіністку ў бікіні»? Жанчына праславілася тым, што хадзіла ў горы выключна ў купальніку, за што і атрымала адпаведную мянушку ў сеціве. У пачатку года яна ў нацыянальным парку на Тайвані звалілася ў цясніну. Здолела выклікаць дапамогу па спадарожнікавым тэлефоне, але ноччу ў гарах тэмпература апусцілася да мінус двух градусаў, а знайшлі пацярпелую толькі праз 28 гадзін...

Гэта, канешне, крайнасць. Але цяга да экстрыму, відаць, у крыві многіх, у распрацоўшчыкаў прадукту — дакладна. Што пацвярджае новы трэнд у адзенні — джынсавыя... трусы за амаль 300 долараў *(на здымку)*. Так, не шорты, а менавіта сподняя бялізна, якая, па задуме дызайнераў, павінна стаць модняй навінкай у лінейцы жаночага адзення вясны-лета 2019 года. Гэткі пропуск у свет гламуру. «Яе можна насіць пад штанамі ці зверху іх, гэта значыць, што яна больш універсальная, чым самая звычайная сподняя бялізна». Менавіта так рэкламуюць той самы «прадукт» вытворцы. Балазе, у сеціве даволі скептычна паставіліся да джынсавых шортаў-трусоў. («Дзіўная справа: усяго чатыры дні не галіўся, а куртка ўжо сядзіць як крадзеная».) Як думаеце, з'явіцца тая навінка на нашых вуліцах летам?..

Дарэчы, згодна з вынікамі праведзенага летась сацыялагічнага даследавання па пытаннях гендарнай дыскрымінацыі на рынку працы, чвэрць беларусаў сутыкаюцца на сваіх рабочых месцах з неабгрунтаванымі патрабаваннямі да знешняга выгляду. На першым месцы ў спісе дыскрымінуючых умоў для мужчын — неабходнасць насіць строгі касцюм незалежна ад умоў надвор'я і наяўнасці кантактаў з кліентамі. («На рабоце ў нас строгі дрэс-код. Адзінае паслабленне: падчас водпуску на работу можна прыходзіць у джынсах».) Самыя распаўсюджаныя патрабаванні да знешняга выгляду жанчын таксама традыцыйныя, — быць у сукенках, спадніцах. («Ва ўсіх дзяўчат матылькі ў жываце патрабуюць кахання, і толькі моль у жываце Тамары патрабуе футра».) Што цікава, толькі 17,7 працэнта працаўнікоў спрабуюць змагацца з такой сітуацыяй. («Афіснаму работніку на заметку. Калі ў ваш кабінет часта заходзяць без стуку, павесьце звонку на дзверы мішэнь для дартса. Праверана!») Між тым даследчыкі кажуць, што дрэс-код апраўданы, калі ён абгрунтаваны, — забяспечвае бяспеку работнікаў, падкрэслівае прафесійныя традыцыі. У астатніх выпадках на першым месцы павінны быць не знешнасць, а кампетэнцыі.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**



Група ў складзе Максіма Вінчэўскага, Аляксандра і Міхаіла Вайцюкоў, Дзяніса Жыдкова і Міхаіла Макеенкі паспяхова пераадолела маршрут на Манблан.

# «ПА ЗВАННІ Ў ГОРЫ НЕ ХОДЗЯЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Напрыклад, калі мы з камандай хадзілі на пік Камунізму, выйшлі на плато на шасці тысячах, а там нас заспела непагадзь, прыйшлося сядзець на адным месцы каля трох дзён. Ад надвор'я, перш за ўсё, залежыць хуткасць праходжання маршруту: чым хутчэй гэта адбылося, тым менш стамляешся. Тады альпініст больш адэкватны і можа разумна ацэньваць усе рызыкі. Калі надвор'е добрае, то ўсё залежыць ад цябе, калі дрэннае, то прыходзіцца змяняць графік, рабіць так званую адседку, чакаць.

**— Раслумачце больш падрабязна, што для альпініста азначае дрэннае надвор'е?**

— Дажджу наверсе звычайна няма, там снег і заўсёды мінусавая тэмпература. Калі ідзе снег, то няма бачнасці, а калі моцны вецер, вялікая рызыка атрымаць абмаражэнні. Спякота можа быць толькі днём. Калі свеціць сонца, а вакол снег, атрымліваецца, што ты быццам бы ў лінзе. А калі сонца няма, то заўсёды холадна.

**— Які абавязковы набор павінен мець з сабой горны турыст?**

— Вельмі цёплы пухавік, такія вырабляюць спецыялізаваныя фірмы, мы называем яго хатай. У ім, як у доміку, — цёпла, суха і ўтульна. Цёплыя добрыя чаравікі, зручны заплечнік, таму што ён заўсёды з табой, трэба каб нідзе не націраў і не выклікаў дыскамфорту.

**— Што датычыцца харчавання, прадукты бераце з сабой?**

— Так, штосьці з сабой, нешта закупляем на месцы. Мяса звычайна вязём з Беларусі, робім дамашнюю тушонку (мяса вываргаюць у тлушчы так, каб яно не сапсавалася за 30—40 дзён). Таксама бяром з сабой крупы, сухія супы, сухую гародніну. У паходах нават варым боршч, для гэтага выкарыстоўваем спецыяльныя каструлі (тыпу скараваркі) і гарэлкі.

**— Адпраўляючыся ў такія доўгія паходы, як трымаеце сувязь з роднымі?**

— Звычайна бяром у арэнду спадарожнікавыя тэлефоны, таму практычна заўсёды знаходзімся на сувязі. Праўда, у вузкай цясніне яна можа перарывацца ці ўвогуле знікаць, тэлефоны ламаюцца або батарэйка садзіцца. На так званай Вялікай зямлі ёсць чалавек — сувязны, ён дасылае нам прагноз надвор'я, а мы яму тэлефануем, расказваем, што ў нас адбываецца, ён пры дапамозе спецыяльнай рассылкі перадае гэта нашым родным.

**— Сям'я спакойна прымае ваша хобі?**

— Мы з жонкай пазнаёміліся ў горна-турыстычным клубе, таму яна ўсё гэта разумее, спакойна адпускае мяне. У нас трое дзяцей, старэйшы ўжо просіцца са мной у горы. Пакуль яму ўсяго пяць, таму ходзім толькі на маленькія горачкі, напрыклад, летась на адпачынку ў Крыме ён папрасіўся ў паход, падняліся на ўзвышша, каб палюбавацца морам. А ў жонкі цяпер іншае захапленне — яна лётае на параплане.

**— Ваша самая высокая вяршыня — 7495 метраў, пік Камунізму, якая наступная мэта?**

— Васьмітысячнік, але яго пакуль не плануем, таму што гэта даволі дарагое мерапрыемства. Вельмі хацелася б прайсці ўвесь шлях, які хадзілі раней усе першаадкрывальнікі разам з караванам. Пажыць там, пранікнуцца духам, бо гэта такія значныя месцы, як Індыя, Пакістан, Тыбет, Кітай.

**— Каб атрымаць званне «Снежны барс», вам засталася скарыць адну вяршыню, калі плануеце гэта зрабіць?**

— Пік Хан-Тэнгры, пік Перамогі, пік Камунізму і пік Я. Каржанеўскай у мяне ўжо ёсць, засталося падняцца толькі на пік Леніна. Калі будзе магчымасць, не ўпушчу, але спецыяльна рабіць гэтага не буду. Па званні ў горы не ходзяць.

Бываю ў паходах, калі ёсць фінансавая магчымасць і адпускае сям'я.

**— Колькі грошай трэба, каб адправіцца ў горы?**

— Як правіла, гэта каштуе каля тысячы-паўтары долараў. Сума ўключае пералёты, праезд, харчаванне на цэлы месяц.

**— Што вы адчуваеце, калі скарэце чарговую вяршыню?**

— На самой вяршыні — нічога, думаеш пра тое, як спусціцца, эйфарыя прыходзіць унізе, калі разумееш, што ўсё ўдалося. У альпінізме самае галоўнае — вярнуцца. Людзі выкладваюцца цалкам, калі ідуць наверх, а на зваротным шляху сілы заканчваюцца, пачынаецца непагадзь, і тады ў стомленым стане альпіністы дапускаюць памылкі.

**— У маі вы сталі адным з тых, хто падняў агонь ІІ Еўрапейскіх гульняў на Манблан. Раскажыце, як гэта адбылося?**

— Ідэя таго, каб «Полымя міру» пабывала на вышэйшай кропцы Заходняй Еўропы ўзнікла ў старшыні федэрацыі альпінізму, Дырэкцыя Гульняў яе падтрымала. Мы пачалі падрыхтоўку, быў сабраны калектыў, таму што ў горным турызме і альпінізме вельмі важная каманда. Неабходна, каб людзі адно аднаго ведалі, хадзілі разам у паходы і разумелі таварышаў з паўслова, як сям'я. Атмасфера ў калектыве — гэта аснова поспеху.

Што да самога ўзыходжання, мы не адразу адправіліся на вяршыню з факелам, спачатку рабілі пару акліматызацыйных выхадаў. За гэты час зразумелі, што сёлета не будзе лёгка, таму што лінія снегу знаходзілася досыць нізка, яна пачалася ўжо на вышыні паўтары тысячы метраў, а звычайна — з дзвюх тысяч. Як правіла, такі маршрут праходзяць за тры дні, а ў нас пайшло на яго пяць дзён.

**— Якія пачуцці былі падчас таго падняцця?**

— Стаць удзельнікам такой падзеі было вялікім гонарам для мяне. Хвалююча было, у першую чаргу таму, што вельмі хацелася, каб усё атрымалася. У першы паход мы пратапталі вельмі шмат снегу, але была непагадзь, таму было не зразумела, замяло нашы сляды ці не, ці паспеем мы спусціцца. Аказалася, што намяло няшмат, а з факелам мы падняліся ўжо ў два разы хутчэй.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 12.06.2019 г.

## Учреждение образования «БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИНФОРМАТИКИ И РАДИОЭЛЕКТРОНИКИ»

### ПЛАН ПРИЕМА В АСПИРАНТУРУ БГУИР в 2019 году НА БЮДЖЕТНУЮ ФОРМУ ОБУЧЕНИЯ ПО СЛЕДУЮЩИМ СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:

| Шифр и название специальностей | Дневная форма обучения | Заочная форма обучения | Соискательство |
|---|---|---|---|
| **АСПИРАНТУРА** | | | |
| 01.04.03 Радиофизика | - | - | - |
| 01.04.04 Физическая электроника | 1 | - | - |
| 01.04.05 Оптика | - | - | - |
| 01.04.07 Физика конденсированного состояния | 1 | - | - |
| 05.09.05 Теоретическая электротехника | - | - | - |
| 05.11.08 Радиоизмерительные приборы | 4 | - | - |
| 05.11.15 Метрология и метрологическое обеспечение | - | - | - |
| 05.11.17 Приборы, системы и изделия медицинского назначения | - | 1 | - |
| 05.12.04 Радиотехника, в том числе системы и устройства телевидения | 9 | 1 | 1 |
| 05.12.07 Антенны, СВЧ устройства и их технологии | - | - | - |
| 05.12.13 Системы, сети и устройства телекоммуникаций | 4 | 1 | 1 |
| 05.12.14 Радиолокация и радионавигация | - | - | - |
| 05.13.01 Системный анализ, управление и обработка информации | 6 | 3 | 1 |
| 05.13.05 Элементы и устройства вычислительной техники и систем управления | 1 | - | - |
| 05.13.06 Автоматизация и управление технологическими процессами и производствами | 1 | - | - |
| 05.13.10 Управление в социальных и экономических системах (технические науки) | - | - | - |
| 05.13.11 Математическое и программное обеспечение вычислительных машин, комплексов и компьютерных сетей | 5 | 1 | - |
| 05.13.12 Системы автоматизации проектирования | - | - | - |
| 05.13.15 Вычислительные машины, комплексы и компьютерные сети | - | 2 | - |
| 05.13.17 Теоретические основы информатики | 2 | - | - |
| 05.13.18 Математическое моделирование, численные методы и комплексы программ | 1 | 1 | - |
| 05.13.19 Методы и системы защиты информации, информационная безопасность | - | 1 | - |
| 05.16.08 Нанотехнологии и наноматериалы – (физико-математические и технические науки) | 4 | - | - |
| 05.26.01 Охрана труда | - | 1 | - |
| 05.26.02 Безопасность в чрезвычайных ситуациях | - | - | - |
| 05.27.01 Твердотельная электроника, радиоэлектронные компоненты, микро- и наноэлектроника, приборы на квантовых эффектах | 4 | - | - |
| 05.27.06 Технология и оборудование для производства полупроводников, материалов и приборов электронной техники | 3 | - | - |
| 08.00.05 Экономика и управление народным хозяйством | - | 1 | - |
| 08.00.13 Математические и инструментальные методы экономики | 1 | - | - |
| 19.00.03 Психология труда, инженерная психология, эргономика (технические науки) | - | - | 1 |
| **ИТОГО:** | **46** | **13** | **4** |
| **ДОКТОРАНТУРА** | | | |
| 05.11.17 Приборы, системы и изделия медицинского назначения | - | | 1 |
| 05.13.01 Системный анализ, управление и обработка информации | 1 | | |
| 05.13.11 Математическое и программное обеспечение вычислительных машин, комплексов и компьютерных сетей | 1 | | |
| 05.27.06 Технология и оборудование для производства полупроводников, материалов и приборов электронной техники | 1 | | |
| **ИТОГО:** | **3** | | **1** |

Лица, поступающие в аспирантуру на конкурсной основе, должны иметь:

высшее образование;

склонность к научным исследованиям, что подтверждается научными публикациями, участием в научно-исследовательских и инновационных проектах, конференциях или другими материалами;

рекомендацию ученого совета учреждения высшего образования или факультета этого учреждения (для поступающих в год окончания обучения в магистратуре);

опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования и научные публикации для поступающих на заочную форму обучения и в соискательство;

удостоверение о сдаче кандидатских экзаменов и зачетов по общеобразовательным дисциплинам.

Лица, поступающие в аспирантуру для обучения в дневной или заочной форме получения образования, сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме учебной программы I ступени высшего образования.

Лица, не прошедшие по конкурсу на обучение за счет средств республиканского бюджета, получившие на вступительном экзамене оценку не ниже чем "четыре", имеют право участвовать в конкурсе на обучение в аспирантуре на платной основе.

Весь комплект документов для заполнения можно получить с 02.09.2019 в отделе аспирантуры, ул. П. Бровки, д.4, 2-й уч. корпус, ауд. 410.

Прием и зачисление в аспирантуру осуществляется на конкурсной основе с 1 по 31 октября. Начало занятий в аспирантуре – 1 ноября.

**Срок обучения в аспирантуре не должен превышать по дневной форме – 3 года, по заочной – 4 года, в форме соискательства – 5 лет.**

**Адрес: 220013, Минск, ул. П. Бровки, д. 4, 2-й уч. корпус, ауд. 410.**
**Телефоны для справок; 293-21-06; 293-21-05.**
**e-mail: otdaspir@bsuir.by**

УНП 100347005

## Учреждение образования «Могилевский государственный университет продовольствия»

### ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ НА 2019 ГОД

по следующим отраслям науки и специальностям научных работников

**АСПИРАНТУРА**

| Шифр и наименование | План приема | | |
|---|---|---|---|
| | дневная форма | заочная форма | соискательство |
| 01.14.14 Теплофизика и теоретическая теплотехника | – | – | – |
| 02.00.00 Химические науки | | | |
| 02.00.01 Неорганическая химия | – | – | – |
| 02.00.04 Физическая химия | – | – | – |
| 05.02.13 Машина, агрегаты и процессы (пищевая промышленность) | – | – | – |
| 05.13.06 Автоматизация и управление технологическими процессами и производствами (промышленность) | – | 1 | – |
| 05.17.06 Технология и переработка полимеров и композитов | – | 1 | – |
| 05.18.01 Технология обработки, хранения и переработки злаковых, бобовых культур, крупяных продуктов, плодоовощной продукции и виноградарства | – | 2 | – |
| 05.18.04 Технология мясных, молочных и рыбных продуктов и холодильных производств | – | 1 | – |
| 05.18.07 Биотехнология пищевых продуктов и биологических активных веществ | – | – | – |
| 05.18.12 Процессы и аппараты пищевых производств | – | – | – |
| 05.18.15 Технология и товароведение пищевых продуктов, продуктов функционального и специализированного назначения и общественного питания | 1 | – | – |
| 08.00.05 Экономика и управление народным хозяйством | – | – | – |

**ДОКТОРАНТУРА**

| Шифр и наименование | План приема | |
|---|---|---|
| | дневная форма | соискательство |
| 05.18.01 Технология обработки, хранения и переработки злаковых, бобовых культур, крупяных продуктов, плодоовощной продукции и виноградарства | – | 1 |
| 05.18.12 Процессы и аппараты пищевых производств | – | – |

Сверх плана приема для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета проводится прием на платной основе на все специальности аспирантуры и докторантуры.

**Прием документов с 1 по 30 сентября 2019 года.**

**Справки по тел.: (0222) 64-79-14, (0222) 64-98-06**

УНП 700036606

## Учреждение образования «Витебский государственный технологический университет»

### объявляет прием в аспирантуру и докторантуру в 2019 году в соответствии с контрольными цифрами приема для получения послевузовского образования

***за счет средств республиканского бюджета по следующим специальностям:***

| Шифр и наименование специальности | Аспирантура | | | | Докторантура |
|---|---|---|---|---|---|
| | Всего | Из них по форме обучения | | | |
| | | Дневная | Заочная | Соискательство | Дневная |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 05.02.08 – Технология машиностроения | 5 | 2 | 2 (1-целевая) | 1 (целевая) | - |
| 05.13.06 – Автоматизация и управление технологическими процессами и производствами (легкая промышленность) | 1 | 1 | - | - | - |
| 05.19.01 – Материаловедение производств текстильной и легкой промышленности | 2 | 2 (1-целевая) | - | - | - |
| 05.19.02 – Технология и первичная обработка текстильных материалов и сырья | 2 | 2 | - | - | 1 |
| **Всего** | 10 | 7 | 2 | 1 | 1 |

Также осуществляется прием в аспирантуру и докторантуру за счет средств юридических и физических лиц.

**Документы для поступления принимаются с 1 августа по 30 сентября 2019 года.**

**Полную информацию можно получить по адресу: 210038, г. Витебск, Московский пр., 72, каб. 214, тел. 8 (0212) 49-53-21.**

**Подробности на сайте: www.vstu.by.**

УНП 300031282

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении аукциона** | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Индивидуальный предприниматель Кокоулина Алеся Константиновна, УНП 291005702, г. Брест, ул. Вульковская, д. 86, кв. 58 |

**Предмет аукциона, расположенный по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Задворская, д. 4**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Изолированное помещение № 4** (административное помещение) | 354,5 кв. м | 100/D-73865 |

**Начальная цена без учета НДС:** 53 100 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY76BLBB30120191021390001004** в евро (**EUR**) – **BY33BLBB30120191021390001002;** в российских рублях (**RUB**) – **BY22BLBB30120191021390001006** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, , получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **16.07.2019** в 12.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **12.07.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «МОСТОСТРОЙ» филиал «Мостоотряд № 58»

Предмет торгов: лот – капитальное строение с инвентарным номером 100/С-86216 (наименование – склад II группы; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 2 039,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029588 площадью 2,0163 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 108Г.

Составные части и принадлежности: забор железобетонный, линия электропередачи, система водопровода

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **147 366,00** | **Размер задатка, руб.** | **3 120,00** |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 28 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 27 июня 2019 г. до 17.00**

*** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта, а также вознаграждение Организатору аукционных торгов**

**Ранее извещение о продаже имущества ОАО «МОСТОСТРОЙ» филиал «Мостоотряд № 58» опубликовано в газете «Звязда» от 16.05.2019 г.**

## Открытое акционерное общество «Сберегательный банк» Беларусбанк» филиал № 601 в г. Молодечно) проводит открытый аукцион по продаже имущества

**Наименование объекта:**

**Лот № 1** – капитальное строение (здание гаража на 4 бокса) с инвентарным номером 633/С-14032 общей площадью 100,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Мядель, ул. Шаранговича, 10А/21.

**Начальная цена** продажи составляет 9600,00 руб., в том числе НДС по ставке 20 % – 1600,00 рублей с возмещением расходов по проведению рыночной оценки в размере 388,80 руб., в том числе НДС (20 %) – 64,80 руб. Сумма задатка 480,00 руб.

**Лот № 2** – изолированное помещение с инвентарным номером 630/D-31693 (гаражные боксы) общей площадью 439,40 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Громадовская, 4-1.

**Начальная цена** продажи составляет 167492,12 рублей, в том числе НДС по ставке 20 % 27915,35 руб. Сумма задатка 8374,61 руб.

**Лот № 3** – изолированое помещение с инвентарным номером 630/D-31690 (зал для физической подготовки) общей площадью 588,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Громадовская, 4-2.

**Начальная цена** продажи составляет 371079,91 руб, в том числе НДС по ставке 20 % 61846,65 руб. Сумма задатка 18554 руб.

**Аукцион состоится 4 июля 2019 г. в 10.00** по адресу: ул. Притыцкого, 13 г. Молодечно, зал заседаний.

**Заявления и документы на участие принимаются по 28 июня 2019 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 16.00 по адресу: ул. Притыцкого,13 г. Молодечно, каб. 315 (тел. 80176 74-96-40).

Для участия в аукционе представляется заявление, к которому прилагаются : заявление об ознакомлении с документами и объектами аукциона; копия документа о перечислении задатка на счет BY59AKBB66318588000496100000 в филиале № 601 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600198997; код AKBBBY21601; доверенность представителю, заверенные копии учредительных документов и свидетельств о государственной регистрации, для физических лиц-копии паспорта.

При подаче заявления с приложением необходимых документов с организатором аукциона заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (покупатель) оплачивает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с документами и имуществом **(80176 74-96-40, 8 (029) 320-21-93).**

Договор купли-продажи с победителем аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня завершения аукциона и оформления протокола.

# «НАША ЗАДАЧА — ЗРАБІЦЬ СВЯТА»

## ЦЫРЫМОНІІ АДКРЫЦЦЯ І ЗАКРЫЦЦЯ

Спецыялісты Дырэкцыі II Еўрапейскіх гульняў адзначаюць, што работы па сцэнічным абсталяванні на стадыёне «Дынама» для цырымоніі адкрыцця Гульняў ідуць па плане. Ужо змантаравана трасавая дарога, цяпер спецыялісты займаюцца наладкай святла і ўстаноўкай гуку, усе гэтыя сістэмы тэстуюцца. **Начальнік аддзела арганізацыі і правядзення цырымоніі адкрыцця і закрыцця «Дырэкцыі II Еўрапейскіх гульняў» Алеся РУЛЬКОВА** адзначае, што аматары спорту ўбачаць у Мінску вялізныя дэкарацыі — такога маштабу ў краіне яшчэ не было. Па сярэдзіне стадыёна размесціцца велізарная сцэна, якая будзе круціцца на 360 градусаў, гэта значыць, любы глядач з любога месца ўбачыць абсалютна ўсё.

*«Асноўнае патрабаванне артыстаў, якія прыедуць у Мінск, — добры гук,* — расказвае Алеся Рулькова і дадае, што асаблівых капрызаў зоркі эстрады не выказвалі. — *Усё ж такі большасць артыстаў — гэта прадстаўнікі беларускай эстрады, таму што канцэпцыя цырымоніі адкрыцця прадугледжвае аповед пра нашу краіну, яе гісторыю і сучаснасць. Мэта цырымоніі — расказаць усяму свету пра Беларусь».*

Сцэнарый цырымоніі адкрыцця Гульняў стварала беларуска-расійская каманда, з беларускага боку выступаў Аляксандр Вавілаў, з расійскага — Аляксей Сечынаў. У паслужным спісе Вавілава «Славянскі базар у Віцебску», а яго расійскі калега выступаў стваральнікам цырымоніі адкрыцця Азіяцкіх гульняў у 2011 годзе, цырымоніі адкрыцця Універсіяды ў Казані і многіх іншых маштабных праектаў.

*«Ужо цяпер у шоу задзейнічана больш за 1300 чалавек. Кастынгі для артыстаў і танцораў праходзілі ў лютым, рэпетыцыі пачаліся з сакавіка. Пакуль рэпетыцыі праходзяць невялікімі кавалачкамі, а 16 чэрвеня мы ўжо пачнём рэпеціраваць на самім стадыёне «Дынама» і складзём усе фрагменты ў адзіную карцінку»,* — адзначае Алеся Рулькова.

Гаворачы пра цырымоніі, мы часта забываем пра шоу-закрыццё. Падрыхтоўка да яго таксама ідзе поўным ходам. У цырымоніі закрыцця Еўрапейскіх гульняў у Мінску будзе асобная канцэпцыя — яна не стане працягам цырымоніі адкрыцця, не будзе яе паўторам. Шоу будзе арыентавана на эмацыянальны стан спартсменаў падчас самых спаборніцтваў, на перажыванні, якія яны зазнаюць на працягу турніру. *«Мы пастараемся захаваць іх поспехі і паражэнні і паказаць гэта»,* — адзначае Алеся Рулькова. Спецыяліст дадала, што на цырымоніі закрыцця выступяць зусім іншыя артысты, іх будзе вельмі шмат, а іх вядомасць дакладна не саступае вядомасці тых выканаўцаў, якія выступяць на цырымоніі адкрыцця.

## МЕДАЛЬНЫЯ ЎЗНАГАРОДЖАННІ

Самы прыемны час для пераможцаў — медальнае ўзнагароджанне. У Мінску падчас II Еўрапейскіх гульняў гэтыя цырымоніі будуць праводзіцца на 16 пляцоўках (15 спартыўных і фан-зона каля Палаца спорту, дзе будуць узнагароджвацца пераможцы і прызёры спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы). Усе цырымоніі пройдуць па адзіным пратаколе і пад спецыяльна напісаную беларускім кампазітарам Леанідам Шырыным музыку, але кожная з цырымоній мае свой сцэнарый.

*«Дапамагаць узнагароджваць спартсменаў афіцыйным асобам будуць 95 дзяўчат, 70 з іх — прафесійныя мадэлі Нацыянальнай школы прыгажосці, а 25 — валанцёры, якія былі адабраны на кастынгу, дзе конкурс склаў шэсць чалавек на месца,* — расказвае **начальнік аддзела арганізацый і правядзення медальных цырымоній фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў» Вольга УЛАДЗІМІРАВА.** — *Усе яны прайшлі спецыяльнае навучанне ў Нацыянальнай школе прыгажосці па дэфіле, акцёрскім майстэрстве, вывучылі асновы стылю, макіяжу і прычоскі. Зараз у нас праходзяць рэпетыцыі, на якіх мы адпрацоўваем маршруты, бо таймінг цырымоній будзе вельмі жорсткі, таму што ўвесь час ідуць тэлевізійныя трансляцыі. Час паміж цырымоніямі — хвіліна, паўтары. А перад гэтым нам трэба яшчэ правесці падрыхтоўчыя брыфінгі для спартсменаў і афіцыйных асоб, каб усе разумелі, што трэба рабіць і куды ісці падчас цырымоніі ўзнагароджання»,* — расказала спецыяліст.

## ФАН-ЗОНЫ ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ

Падчас Гульняў у Беларусі будзе працаваць 10 фан-зон: тры з іх у Мінску, сем — у абласных і іншых буйных гарадах краіны. У Брэсце фан-зона размесціцца на стадыёне «Брэсцкі», у Гродне — на стадыёне «Нёман», у Віцебску — на плошчы Перамогі, у Магілёве — на набярэжнай Дняпра каля абласнога Палаца культуры. У Гомелі пляцоўка фан-зоны будзе працаваць каля мясцовага Лядовага палаца, у Бабруйску — на стадыёне імя Аляксандра Пракапенкі, у Маладзечне — на пляцоўцы летняга амфітэатра.

На ўсіх фан-зонах размесцяцца велізарныя экраны, там жа можна будзе не толькі паглядзець спаборніцтвы, але і перакусіць. *«Фудкорты будуць арганізаваны на ўсіх пляцоўках, прычым некаторыя здзівяць сваёй незвычайнасцю,* — расказвае **вядучы спецыяліст фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў» Павел КАРАНЕЎСКІ.** — *Палац спорту — наша галоўная фан-зона, там будзе найбольш розных актыўнасцяў, напрыклад, там жа можна будзе пакаштаваць унікальную кухню краін — удзельніц Гульняў. Пасольства арганізоўвае спецыяльныя пункты харчавання з нацыянальнымі кухнямі, замежныя кухары прывязуць свае ўнікальныя рэцэпты, іх стравы можна будзе пакаштаваць па даступных цэнах».*



Фота БелТА.

Галоўная фан-зона каля Палаца спорту ў Мінску пачне сваю работу 19 чэрвеня, астатнія адкрыюцца 21 чэрвеня. Пляцоўкі будуць прымаць гасцей з 10 раніцы да 23 гадзін, некаторыя фан-зоны і да паўночы, а 21 і 30 чэрвеня пляцоўка каля Палаца спорту будзе працаваць да 4 гадзін раніцы.

Кожная фан-зона будзе мець сваю тэматыку. Напрыклад, пляцоўка каля Палаца спорту — міжнародная, кожны дзень там будуць праходзіць дні культуры і традыцый краін-удзельніц. Так, дзень Азербайджана адбудзецца 20 чэрвеня, 21-га — дзень Ізраіля, 22-га — Вялікабрытаніі і так далей. Скончацца ўсё 30 чэрвеня днём беларускай культуры. У гэтыя дні на фан-зоне выступяць замежныя артысты — найбольш цікавых прадстаўнікоў сваіх краін выбіраюць і прывозяць у Беларусь самі пасольствы.

Фан-зона каля «Мінск-Арэны» будзе мець танцавальны фармат, перад балельшчыкамі будуць прадстаўлены найлепшыя танцоры і дыджэі краіны. Пляцоўка каля «Чыжоўка-Арэны» стане фан-зонай папулярнага фармату, кожны дзень там будуць выступаць вядомыя беларускія выканаўцы.

Кожная пляцоўка гатовая прыняць сем'і ў поўным складзе, у тым ліку дзяцей. Для маленькіх аматараў спорту падрыхтаваны не проста куткі з забаўкамі — у Мінск прыедуць аніматары і клоўны з розных краін, для таго каб беларускія дзеці маглі пагуляць у нацыянальныя гульні Германіі, Ізраіля, Швецыі і г. д.

Акрамя гэтага, фан-зоны ў Мінску прадставяць мінчанам і гасцям віды спорту, якія не ўвайшлі ў спаборніцкую праграму. Напрыклад, на плошчы Незалежнасці пройдуць паказальныя выступленні па лёгкай атлетыцы (трыятлон і забег з парашутам). А каля Палаца спорту будуць прадстаўлены петанк, гістарычнае фехтаванне і традыцыйныя віды барацьбы (напрыклад, нацыянальная азербайджанская).

Для прагрэсіўнай моладзі і аматараў віртуальнай рэальнасці ў ГЦ «Галерэя» можна будзе згуляць у танчыкі, а ў «Арэна-Сіці» — паспрабаваць сябе ў кіберспорце.

Фестывальная зона II Еўрапейскіх гульняў размесціцца ў парку «Дрымлэнд». Яна запрацуе ў дзень цырымоніі адкрыцця і будзе дзейнічаць да 2 ліпеня. Там балельшчыкаў і гасцей сталіцы чакаюць пяць сцэн, дзе выступяць 350 артыстаў розных музычных жанраў, велізарная зона фудкортаў, фанзона для балельшчыкаў, зона традыцый, дзе пройдуць рыцарскія турніры, танцы, гульні, кірмаш раменікаў, геймінг-зона і зона віртуальнай рэальнасці, спартыўныя забавы, дзіцячая пляцоўка, арт- і рэлакс-зоны, мікс-зона з палётамі на паветраным шары.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


В суд Советского района г. Гомеля поступило заявление Буланович Татьяны Владимировны об объявлении умершим гражданина Астапова Виктора Васильевича, 06.03.1941 года рождения, уроженца м. Хорощ, Белостоцкая обл., последнее известное место жительства – г. Гомель, ул. Мильчанская, д. 5.
Всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения об Астапове Викторе Васильевиче, просьба сообщить их суду Советского района г. Гомеля в течение двух месяцев с момента публикации газеты по адресу: г. Гомель, пр. Речицкий, 45, или по телефонам: 8-0232-29-44-93, 8-0232-29-44-89.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТСКИЙ АВТОБУСНЫЙ ПАРК»**

**Предмет торгов: Лот –** 1) Электрическая кран-балка 12386, год выпуска 1966 г., инв. № 585; 2) Электрокран-балка г/п 1 т, год выпуска 1967 г., инв. № 586; 3) Электрокран-балка, 1965 г., инв. № 685; 4) Электрокран-балка г/п 1 т, год выпуска 1965 г., инв. № 686; 5) Электрокран-балка г/п 1 т, год выпуска 1965 г., инв. № 688; 6) Электрокран-балка г/п 1 т, год выпуска 1965 г., инв. № 689; 7) Электротельфер, год выпуска 1965 г., инв. № 690; 8) Кран-балка г/п 3 т, год выпуска 1977 г., инв. № 802; 9) Кран-балка г/п 3 т, год выпуска 1978 г., инв. № 827; 10) Кран-балка г/п 1 т, год выпуска 1978 г., инв. № 846; 11) Мостовая кран-балка г/п 3 т, год выпуска 1978 г., инв. № 853; 12) Кран опорный г/п 1 т, 4.5 м, год выпуска 1979 г., инв. № 863; 13) Кран подвесной 5-16.8-15-12, год выпуска 1985 г., инв. № 923; 14) Кран подвесной с электроталью, год выпуска 1985 г., инв. № 925; 15) Кран подвесной с электроталью, год выпуска 1985 г., инв. № 929; 16) Кран подвесной 2-16,8-15-6 с электроталью, год выпуска 1985 г., инв. № 939; 17) Кран подвесной 2-16,8-15-6 с электроталью, год выпуска 1985 г., инв. № 940; 18) Кран подвесной однобалочный 3,2-16,8-15-12, год выпуска 1985 г., инв. № 942; 19) Кран подвесной 15,1-4,5-6 с электроталью, год выпуска 1985 г., инв. № 966; 20) Кран-балка подвесная, год выпуска 1989 г., инв. № 2017; 21) Кран-балка опорная 5 т, год выпуска 1989 г., инв. № 2018; 22) Электротельфер ТЭ-0,5, год выпуска 1989 г., инв. № 2022; 23) Кран-балка г/п 3т, год выпуска 1978 г., инв. № 852; 24) Кран опорный г/п 1т. 4,5 м, год выпуска 1979 г., инв. № 862

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **13 552,00** | **Размер задатка, руб.** | **1 355,20** |
| **Условия продажи** | Без условий | | |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |

**Аукцион состоится 27 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 26 июня 2019 г. до 17.00**

*** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта, возмещение затрат Организатору аукционных торгов**

***Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Брестский автобусный парк» опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2019 г.**

**Извещение о проведении 15 июля 2019 года аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Школьник» г. Пинск**

| | |
|---|---|
| Наименование объекта и его место нахождения | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-52537 (кафе «Атлантика») |
| Местонахождение объекта | 225710 г. Пинск, ул. Кирова, 55-61 |
| Сведения об объекте | Нежилое помещение находится на первом этаже во многоквартирном 5-этажном доме, общая площадь 82,0 кв. м. Имеется центральное отопление, электроснабжение, водопровод, канализация |
| Начальная цена продажи | 62 400,00 (шестьдесят две тысячи четыреста рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 3 120, 00 (три тысячи сто двадцать рублей) |
| Продавец и организатор аукциона | ОАО «Школьник» г. Пинск |
| Условия торгов | Без условий |

Аукцион состоится 15 июля 2019 года в 12.00 по адресу: г. Пинск, ул. Революционная, 3, в кабинете директора.

Для участия в аукционе организатору аукциона подается заявление по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:

– заверенную банком копию платежного поручения либо иного документа о перечислении суммы задатка на расчетный счет BY46AKBB30123840084351200000 ф-л № 121 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Пинск, БИК AKBBBY21121, г. Пинск, ул. ИПД, 35, УНП 200297549, ОКПО 14809509, срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе;

– физическим лицам – ксерокопия паспорта;

– юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя;

– иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитной финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

– представителям заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

– при подаче документов на участие в аукционе представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия, и копию учредительных документов. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

Организатор аукциона, опубликовавший извещение, вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения, вправе снять объект с аукционных торгов в любое время до объявления его проданным.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан: подписать протокол в день аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона на указанный в протоколе текущий (расчетный) банковский счет в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить с продавцом договор купли-продажи в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется в белорусских рублях.

Срок оплаты – предоставляется рассрочка платежа сроком до 1 года с ежемесячной индексацией платежей со дня заключения договора купли-продажи (в соответствии с решением Пинского горисполкома от 04.06.2019 № 554) с внесением первоначального платежа в размере не менее 30 процентов цены продажи имущества, с учетом ранее внесенной суммы задатка и в срок, не превышающий 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи (ежемесячные суммы рассрочки, указанные в договоре купли- продажи, индексируются исходя из индекса цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом).

Порядок проведения аукциона определен Инструкцией о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов, находящихся в собственности ОАО «Школьник» г. Пинск, утвержденной протоколом № 20 от 31.05.2019 собрания акционеров ОАО «Школьник» г. Пинск.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: 225710, г. Пинск, ул. Революционная, д. 3, ОАО «Школьник», г. Пинск, с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в рабочие дни по 12 июля 2019 г. включительно. Контактный телефон в г. Пинске (0165) 38 72 22 (кабинет кадры).

Желающим предоставляется возможность предварительно ознакоиться с объектом продажи.

С более подробной информацией об условиях проведения и участия в аукционе можно ознакомиться по тел. 38-72-22, 64-72-97 или непосредственно в ОАО «Школьник» г. Пинск по адресу: г. Пинск, ул. Революционная, 3 (кабинет кадры).

Свидетельство о государственной регистрации общества с ограниченной ответственностью «БелТехДизайнСервис» (УНП 190377912) **считать недействительными в связи с утратой**

**Комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета вносит изменение в извещение о проведении 10.07.2019 аукциона (опубликованного в газете «Звязда» от 04.06.2019 № 102 (28969)) следующего содержания:**

задаток в размере вместо 6 базовых величин читать 1 базовая величина.

УНП 100048181



Нефармат

# ПАЛІТО ДЛЯ ДЭПУТАТА

Аднойчы трапіліся на вочы цікавыя матэрыялы з гісторыі станаўлення самакіравання на Палессі ў перадваенны час. Дацэнт кафедры сусветнай гісторыі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй Бодак правёў па архіўных матэрыялах грунтоўнае даследаванне ў гэтым кірунку. Тэмай для артыкула вучоны ўзяў прыцягненне мясцовых кадраў да работы ў органах савецкай ўлады перад вайной у Ганцавіцкім раёне. Артыкул апублікаваны ў адным з выпускаў зборніка навуковых прац «Вучоныя запіскі Брэсцкага ўніверсітэта» ў 2018 годзе.

На аснове справаздач, тлумачальных і іншых запісак партыйных кіраўнікоў, а таксама пісьмаў ды і даносаў радавых грамадзян даволі цікава паўстаюць вобразы старшыні сельсавета, мясцовага дэпутата. Райкамам партыі, райвыканкамам у тую пару кіравалі людзі прыезджыя, у большай ці меншай ступені падрыхтаваныя. А вось у сельсаветы нярэдка прыходзілі звычайныя вяскоўцы, абраныя аднасяльчанамі. Яны па-рознаму разумелі сваю ролю, па-рознаму карысталіся сваім статусам. Многія з прыведзеных дакументаў выклікаюць усмешку: дзе вясёлую, дзе горкую. Але ж гэта былі першыя крокі самакіравання пры новай уладзе. У прыведзеных цытатах знарок апускаю прозвішчы людзей, магчыма, у вёсках ці гарадах жывуць дзеці альбо ўнукі былых сельскіх кіраўнікоў. Самі заметкі, спадзяюся, будуць цікавыя цяперашнім калегам тагачасных кіраўнікоў.

Вось, скажам, старшыня Чудзінскага сельсавета расчараваўся ў новай уладзе. Аднавяскоўцам ён гаварыў: «Калі б знаў спачатку пра гэтыя калгасы, нізавошта свайго каня не абагуліў бы — потым не без роспачы дадаў — Лепш бы я тады захварэў!» І атрымаў за гэта данос «пільнага» аднасяльчаніна. На жаль, не вядома, што было старшыні за тыя вольныя размовы.

А вось яго калега з Малькавічаў, падобна на тое, нічога не баяўся. І паперы рознага кшталту на яго паступалі рэгулярна. Асабліва ён вызначыўся ў разносах ды лаянцы, даставалася і правым, і вінаватым. Так, адзін прызыўнік сведчыў: «Нават пры панскай Польшчы так не лаяліся, калі адпраўлялі ў армію, а старшыня Х., абраны народам, лаецца на чым свет стаіць». Да гэтага ўказаны старшыня быў замешаны ў сур'ёзным правапарушэнні, але там ён выступіў на баку права і дапамог затрымаць дэбашыра. Прывяду радок з пратакола без перакладу, бо надта ж цікавая мова тых пратаколаў: «... Гад признал себя виновным, но заявил, что милиционер и председатель сами его избили в квартире В. и во дворе клуба. Его (дэбашыра) упекли в Пинскую тюрьму з веществом — железным сердечником». У папярэднім абзацы гаварылася, што тым самым сардэчнікам ад воза дэбашыр спрабаваў кіраўніка мясцовай улады выцяць па галаве.

Дык вось у іншым дакуменце расказваецца, якую непавагу праявілі скандальны старшыня да прадстаўнікоў вышэйстаячых органаў: «Я не разрешаю собрание... Пускай ко мне приезжает кто хочет, не только с района, но даже и с области, я и его могу послать к чертовой матери, потому что я здесь хозяин». Так ён, відаць, разумеў сваю ўладу і свой статус.

А старшыня Хатыніцкага сельсавета, паводле аднаго з дакументаў, напярэдадні 1 мая ў будынку сельсавета развёў бруд, сам жа ў рабочы час ездзіў у суседнюю вёску да кабет, якія вядомыя ў акрузе «вясёлымі» паводзінамі. Ёсць запіска, якая сведчыць, што старшыня і дэпутат Кукаўскага сельсавета па блаце бралі тавары ў краме. Абураным аднавяскоўцам дэтутат Т., які загортваў паліто ў скрутак, так растлумачыў: «Мне, як дэпутату, можна браць у неабмежаванай колькасці». Як тут не згадаць шолахаўскага Дзеда Шчукара, які разумеў любую пасаду як крыніцу прывілеяў. І гісторыя ўпарта і настойліва пацвярджала дзедаву мудрасць...

Ды паліто альбо іншы тавар — дробязі, у параўнанні з тым, што тварыў дэпутат раённага Савета ад Хатыніч. Ён дамагаўся жонкі былога солтыса, якога рэпрэсавалі органы НКУС. Аднойчы гэты гора-выбраннік прыйшоў да жанчыны і прабыў там цэлую ноч. А калі яна рашуча не адказала на заляцанні, то прыгразіў ёй павелічэннем падаткаў. І, відаць, зрабіў бы гэта, але сігнал паступіў у райкам партыі, і дэпутата паставілі на месца.

Яшчэ райкаму партыі давялося ўмяшацца ў працэс папаўнення радоў камсамольскай ячэйкі вёскі Кукава. Бо сакратар ячэйкі патрабаваў «уступны ўзнос» у памеры літра самагонкі. Капанулі, як той казаў, глыбей, і высветлілася, што гэты сакратар пры папярэднім уладзе быў асуджаны за крадзяжы, а тут рашыў падаца на кіруючую пасаду ў маладзёжнай арганізацыі. Таму ледзь не ў кожным рашэнні райкама гаварылася пра адукацыю, вучобу і выхаванне кадраў, што, дарэчы, да гэтай пары актуальна. Вось і пазаўчора падчас прызначэння кадраў на самым высокім узроўні прагучала патрабаванне бачыць людзей, быць бліжэй да іх, не дапускаць хамства і чыноўнай ганарыстасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.42 | 17.05 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.40 | 17.21 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.32 | 17.05 |
| Гомель — | 4.34 | 21.19 | 16.45 |
| Гродна — | 4.54 | 21.55 | 17.01 |
| Брэст — | 5.05 | 21.47 | 16.42 |

### Месяц

*Першая квадра 10 чэрвеня.*

*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

### Імяніны

*Пр. Ермія.*

*К. Вольгі, Антона, Германа, Люцыяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 13 ЧЭРВЕНЯ




**1702** год — нарадзіўся Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька, дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, мецэнат. Адбудаваў Нясвіж і Нясвіжскі замак пасля разбурэння шведамі,ператварыў горад у адміністрацыйны цэнтр усіх уладанняў Радзівілаў. Заснаваў у Нясвіжы тэатр Радзівілаў, друкарню, адкрыў корпус кадэтаў, які рыхтаваў афіцэраў. Падтрымліваў існуючыя і адкрываў новыя мануфактуры, у тым ліку Слуцкую мануфактуру шаўковых паясоў, а таксама ў Міры і Альбе — па вырабе габеленаў. Памёр у 1762 годзе.

**1834** год — нарадзіўся (вёска Астраўляны, цяпер у Гарадоцкім раёне) Канстанцін Васільевіч Вераніцын, беларускі літаратар. Вучыўся ў Віцебскай губернскай гімназіі, пасля скончыў Горы-Горацкі земляробчы інстытут, Пецярбургскую медыка-хірургічную акадэмію. Працаваў у Пецярбургу, у Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі. Мяркуецца, што менавіта яму належыць аўтарства вядомай паэмы «Тарас на Парнасе» (1855) і «Два д'ябла» (1860). Асаблівасці мовы і апісаныя жыццёвыя рэаліі ў паэмах сведчаць аб тым, што аўтарства належыць аднаму і таму ж чалавеку. Памёр у 1904 годзе.

**1924** год — нарадзіўся (вёска Барок Бялыніцкага раёна) Васіль Канстанцінавіч Старавойтаў, беларускі гаспадарчы дзеяч, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі . У 1968—1997 гадах ён бязменна ўзначальваў славуты калгас «Рассвет» Кіраўскага раёна. Памёр у 2013 годзе.

**1956** год — нарадзіўся (г. Маларыта) Леанід Аркадзьевіч Тараненка, беларускі спартсмен (цяжкая атлетыка). Заслужаны майстар спорту СССР. Чэмпіён XXII Алімпійскіх гульняў (1980 г., Масква), сярэбраны прызёр XXV Алімпійскіх гульняў (1992 г., Іспанія). Двухразовы чэмпіён і неаднаразовы прызёр чэмпіянатаў свету. Шматразовы чэмпіён Еўропы. 19-разовы рэкардсмен свету.




**1895** год — прайшлі (11—13 чэрвеня) першыя ў свеце аўтамабільныя гонкі (па маршруце Парыж—Бардо—Парыж, працягласцю 1200 кіламетраў), у якіх вырашальным фактарам для вызначэння пераможцы з'явілася максімальная хуткасць яго машыны. З 46 удзельнікаў, якія ўзялі старт у гэтых спаборніцтвах, 29 выкарысталі аўтамабілі з бензінавымі рухавікамі, 15 — з паравымі і два — з электрычнымі.



Пераможцам спаборніцтваў стаў Эміль Левасор. Ён без зменшчыка пераадолеў дыстанцыю прабегу на сваёй двухмеснай машыне Panhard-Levassor (Панар-Левасор) за 48 гадзін 47 хвілін, з сярэдняй хуткасцю ў 24,4 км/г. На жаль, у 1897 годзе Левасор загінуў у аўтакатастрофе падчас гонак Парыж—Марсэль. У Парыжы яму пастаўлены помнік, на пастаменце якога высечаны словы, сказаныя Левасорам адразу пасля заканчэння гонкі Парыж—Бардо—Парыж: «Гэта было вар'яцтва! Я рабіў да трыццаці кіламетраў у гадзіну!»

**1944** год — падчас абстрэлаў Лондана нямецкая авіяцыя ўпершыню выкарыстала крылатую ракету Фау-1, створаную ў нацысцкай Германіі.

## УСМІХНЕМСЯ

**Народная прыкмета: «Калі смартфон падае на твар — пара класціся спаць».**

Жонка — мужу:

— Да мяне заляцаліся самыя прыгожыя і багатыя кавалеры — не тое, што ты!

— Яны былі яшчэ і разумнейшыя за мяне — яны з табой не ажаніліся.

**Прыйшоў да высновы, што наш кот ставіцца да мяне, як да бога. Гэта значыць, ігнаруе маё існаванне да таго часу, пакуль яму ад мяне не нешта не спатрэбіцца.**

— Вы геній!

— Ну-у... Навошта ж так. Можна і на ты.

**Давай пагуляем у хованкі? Ты будзеш хавацца, а я — шукаць каго-небудзь лепшага за цябе.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1988.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 чэрвеня 2019 года.